Хто дапаможа пенсіянеру?

«Па гасцях»... з міліцыяй

Што пачытаць зімовым вечарам?

МС

СТАР.4

СТАР.6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

23 СНЕЖНЯ 2015 г. СЕРАДА № 248 (28106) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ГАЛОЎНАЕ — ІНТАРЭСЫ ЛЮДЗЕЙ

Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка разгледзеў кадравыя пытанні

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

ПАЗНЯКА Аляксандра Рыгоравіча — памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўным інспектарам па Віцебскай вобласці;

ГУР'ЯНАВА Аляксандра Яўгенавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Італьянскай Рэспубліцы, Пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі Аб'яднаных Нацый па сумяшчальніцтве.

Прэзідэнт даў згоду на назначэнне:

ГАРАДЗЕЦКАГА Дзмітрыя Мікалаевіча — старшынёй Жабінкаўскага райвыканкама;

ЗАЙЧУКА Валянціна Міхайлавіча — старшынёй Камянецкага райвыканкама;

ШУМА Мікалая Мікалаевіча — старшынёй Маларыцкага райвыканкама;

АСКЕРКІ Віктара Вітальевіча — намеснікам старшыні Віцебскага аблвыканкама;

САБЫНІЧА Генадзя Генадзьевіча — старшынёй Віцебскага райвыканкама;

СНАРАВА Аляксандра Іванавіча — старшынёй Шумілінскага райвыканкама;

МІКАЛУЦКАГА Аляксандра Віктаравіча — першым намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама;

ГАЙКЕВІЧА Дзмітрыя Сцяпанавіча — старшынёй Жыткавіцкага райвыканкама;

АРХІПЕНКІ Алега Леанідавіча — старшынёй Веткаўскага райвыканкама;

ДЗЕНІСЕНКІ Сяргея Фёдаравіча — старшынёй Рагачоўскага райвыканкама;

КАЗЕЦКАГА Сяргея Іванавіча — старшынёй Любанскага райвыканкама;

ЛЕНКАЎЦА Сяргея Дзмітрыевіча — старшынёй Пухавіцкага райвыканкама;

БАБІЧАВА Аляксандра Мікалаевіча — старшынёй Бярэзінскага райвыканкама;

ЛЯЎКОВІЧА Сяргея Віктаравіча — старшынёй Уздзенскага райвыканкама;

КЛІМАВА Віктара Дзмітрыевіча — пракурорам Брэсцкай вобласці;

МУКВІЧА Уладзіміра Валер'евіча — намеснікам міністра па падатках і зборах;

СІДАРОВІЧА Віктара Іванавіча — дырэктарам Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны;

СТАР. 2

Будні «Гасцінага двара»

Фота БЕЛТА

Аграсядзібу «Гасціны двор», што ў Быхаўскім раёне, добра ведаюць і ў Беларусі, і па-за яе межамі. Сюды з задавальненнем прыязджаюць аматары палявання з Расіі, Германіі, Венгрыі. Толькі летась сядзібу наведалі больш за 100 гасцей. Ды і сёлета гаспадару Міхаілу ДУДЗІКАВУ (на фота) адпачываць няма калі. Яго гаспадарка стала пераможцай конкурсу «Найлепшая аграсядзіба года» ў намінацыі «Найлепшы этнакомплекс», і гэта ганаровае званне трэба пацвярджаць.

ЦЫТАТА ДНЯ

Валянцін ЦЭХМЕЙСТЭР, дырэктар Рэспубліканскага саюза турыстычных арганізацый:

«Беларусы ўсё часцей адпачываюць дома — гэтая тэндэнцыя відавочная. Разам з тым, нам трэба больш актыўна працаваць над уязным турызмам. Тут не ўсё так аптымістычна. Санаторна-курортныя ўстановы заяўляюць аб сваёй запатрабаванасці, але ўвогуле падзенне аб'ёмаў усё ж такі ёсць. Сярод найбольш запатрабаваных напрамкаў у замежных турыстаў можна назваць экскурсійны. Асобныя туркампаніі, якія працуюць па гэтым кірунку, павялічылі ў 2015 годзе прыём турыстаў да 50%. Тут патэнцыял ёсць, акрамя таго, не поўнасцю выкарыстоўваецца патэнцыял медыцынскага турызму».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.12.2015 г.

Долар ЗША	18375,00	▼
Еўра	20044,00	▲
Рас. руб.	258,31	▲
Укр. грыўня	790,32	▲

САЦЫЯЛЬНАЯ МАДЭЛЬ ДЗЯРЖАВЫ ЗАСТАНЕЦЦА НЯЗМЕННАЙ

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са старшынёй Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаілам Ордам.

Кіраўнік дзяржавы выказаў удзячнасць Міхаілу Орду за ўдзел у выбарчай кампаніі. «Мы гэтага абсалютна не ўтойваем: маладзёжныя арганізацыі і вы разам з органамі ўлады зрабілі больш, чым хто-небудзь, для таго, каб на годным узроўні правесці гэтую перадвыбарную кампанію. Вы былі на перадавой, можна сказаць, на лініі фронту, сустракаліся з людзьмі, даводзілі да ведама ўсё, што адбываецца, прасілі іх там, дзе гэта трэба. Людзі нам адказалі дабром, і ў гэтым вялікая ваша заслуга, асабліва прафсаюзнага актыву», — сказаў Прэзідэнт.

«Цяпер наша задача — фарміраваць там, дзе трэба, кіруючы касцяк вертыкалі ўлады і не падмануць людзей. Гэта галоўная наша задача. Хоць мы там і не абяцалі нейкія залатыя горы, тым не менш людзі ж заўсёды чакаюць лепшага і трэба максімальна зрабіць гэтае лепшае», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што яго цікавіць настрой людзей у працоўных калектывах з улікам існуючай сітуацыі ў эканоміцы.

«Год будзе вельмі складаным. І самі вінаваты, асабліва нашы суседзі нарабілі праблем больш, чым дастаткова. І, напэўна, яшчэ спатрэбяцца гады, каб іх вырашаць. Гэта іх праблемы, але і нашы, паколькі гэта асноўныя беларускія рынкі — Расія, Украіна, Казахстан. З Еўрасаюзам усё не так проста. Нашу прадукцыю туды, ведаеце, пускаюць цераз пень-калоду. Яны вельмі моцна абаранілі свой рынак, туды не прарвешся з той прадукцыяй, якая ёсць у нас. У плане таго, што мы вырабляем наменклатуру, якая ў іх ёсць: тыя ж трактары, аўтамабілі, прадукты харчавання, адзенне. Нават калі мы па якасці і цане лепшыя, нас усё роўна туды не пусцяць, прынамсі, прабівацца туды вельмі складана», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Таму выходзім далей, на далёкую дугу, праз В'етнам, Інданезію, Блізкі Усход, Афрыку, Лацінскую Амерыку, там спрабуем нешта прадаць, у Злучаныя Штаты Амерыкі, дзе вельмі выгадны рынак, неяк пакрыху. Але гэта ўсё няпроста. Людзі павінны тое разумець», — дадаў Прэзідэнт.

СТАР. 2

Кнігі як цуд

Калядны дабрачынны баль кнігі прайшоў у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета. Асноўнай тэмай свята, арганізатарамі якога з'яўляюцца Міністэрства інфармацыі і адкрытае акцыянернае таварыства «Белкніга», сёлета стала чытанне ў сям'і.

Фота Кастуся ДРОБАВА

Правядзенне дабрачыннага Балю кнігі напярэдадні Калядаў і Новага года стала выдатнай традыцыяй: ён ладзіцца ўжо чацвёрты раз. Баль і ўнікальны дабрачынны кніжны аўкцыён, што праходзіць у яго рамках, — гэта і падвядзенне вынікаў выдавецкага года, і магчымасць прадставіць самыя яркія праекты, і спроба здзейсніць цуд хоць для невялікай колькасці дзяцей-сірот. Так, сродкі, атрыманыя ад продажу кніжных лотаў штогод пералічваюцца на рахунак аднаго з дамоў-інтэрнатаў краіны. Сёлета атрымальнікам дабрачынных грошай стаў Журавіцкі дом-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, што знаходзіцца ў Рагачоўскім раёне.

Распачынаючы святочны баль, **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ** звярнула ўвагу на знакавыя для айчыннага кнігавыдання падзеі 2015 года:

— Сёлета наша краіна чарговы раз стала ўладальнікам Гран-пры міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі» дзяржаў — удзельніц СНД за кнігу «Беларусь замкавая».

СТАР. 2

КАБ ЁЛКА НЕ АЗМРОЧЫЛА СВЯТА

Ціхі снежаньскі вечар. На вокнах прыватнага дома ў Мінску па-святочнаму пераліваецца рознакаляровымі агеньчыкамі электрычная гірлянда. Раптоўна кухня ў доме асвяцілася яркім агнём. Праз некалькі хвілін полымя разбушавалася ва ўсім памяшканні. Гаспадыню дома абудзіў брэх сабакі. Яна адчула пах дыму, выбегла з дома і выклікала ратаўнікоў. І толькі пасля ўзгадала, што перад тым, як класціся спаць, магчыма, не выключыла гірлянду.

Так разгортваліся падзеі два гады таму. Фінал гэтай гісторыі шчаслівы, калі не лічыць таго, што ў кухні згарэлі ўсе рэчы, а астатнія пакоі хаты полымя паспела закапціць, але туды не дабралася. Потым высветлілася, што пажар здарыўся праз кароткае замыканне электрычнай гірлянды, якую гаспадыня хаты своечасова не выключыла.

Як жа бяспечна сустрэць Новы год? Аб правільным выкарыстанні піратэхнікі мы расказвалі ў мінулым выпуску рубрыкі. Але ёсць тут і другі складнік — любімая ўсімі навагодняя ёлка. Проста прынесці з кірмашу і навесіць на яе гірлянду нельга. Таму карэспандэнт «Звязды» папрасіў **кіраўніка Рэспубліканскага цэнтра прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алену ДЗМІТРУК** расказаць аб тым, як жа правільна выкарыстоўваць ёлку і яе атрыбуты, каб не сапсаваць сабе свята.

СТАР. 4

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Еўрасаюз прыняў мільён мігрантаў

Міжнародная арганізацыя па міграцыі (МАМ) апублікавала даныя, з якіх вынікае, што за 2015 год у Еўропу прыбыло больш за мільён мігрантаў.

Паводле інфармацыі арганізацыі, больш за 800 тысяч чалавек прыбылі на тэрыторыю Старога свету праз Грэцыю і Турцыю — сярод іх 455 000 сірыйцаў і 186 000 афганцаў. У выніку здарэнняў на моры загінулі амаль 3,7 тысячы мігрантаў. У параўнанні з папярэднім годам, колькасць вымушаных перасяленцаў вырасла ў чатыры разы. У асноўным у Еўропу імкнуцца трапіць бежанцы з ахопленых вайной краін — Сірыі, Ірака, Лівіі, Афганістана. Шэраг краін Еўрапейскага саюза, якія раней прымалі мігрантаў, заявілі аб вычарпанні ліміту, у прыватнасці шведскія ўлады паведамілі, што краіна не зможа размясціць яшчэ больш бежанцаў, і параілі ім заставацца ў Германіі, якая прыняла больш за ўсіх мігрантаў. 14 снежня з'явіліся паведамленні, што Берлін вырашыў прыняць меры для змяншэння патоку бежанцаў.

Falcon 9 упершыню паспяхова вярнулася на Зямлю

Ракета-носьбіт Falcon 9 амерыканскай прыватнай кампаніі SpaceX з 11 тэлекамунікацыйнымі спадарожнікамі ў панядзелак паспяхова стартавала з касмадрома на мысе Канаверал, штат Фларыда. У вызначаны час шматразовая першая ступень аддзялілася ад ракеты-носьбіта і ўпершыню ў гісторыі паспяхова вярнулася на Зямлю. Планавалася, што яна прызямліцца на базе ВПС ЗША на мысе Канаверал за 10 кіламетраў ад месца старту. Пазней у SpaceX паведамілі, што ўсе 11 спадарожнікаў выведзены на арбіту.

Паспяховае вяртанне касмічнага чаўнака можа адкрыць новую эру ў развіцці касмічных падарожжаў. Да гэтага 28 чэрвеня ракета Falcon 9 з грузавіком Dragon кампаніі SpaceX, якая стартавала да Міжнароднай касмічнай станцыі, выбухнула на трэцяй хвіліне пасля ўзлёту, а 15 красавіка шматразовая першая ступень ракеты-носьбіта Falcon 9, якая стартавала таксама з Dragon, здзейсніла няўдалую пасадку на платформу ў Атлантычным акіяне.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Сучаснае жыццё робіць людзей дурнейшымі, чым яны маглі б быць

Доктар Джэні Брокіс, спецыяліст у галіне здароўя мозга, упэўнена: усе людзі разумныя, аднак стрэс, паспешнасць у працы, няўважлівасць прымушаюць нас быць інтэлектуальна менш развітымі. Стрэс уплывае на разумовую дзейнасць усіх людзей, пакутуюць нават дзеці. Больш за тое, за апошні час змянілася сама мадэль разумовай дзейнасці.

«Цяпер ад нас патрабуецца думаць больш абстрактна. Раней жа людзі думалі ў больш практычным ключы. Праз стрэс мы ўсе знаходзімся ў рэжыме выжывання. Нашы эмоцыі пачынаюць дамінаваць, і мы ўжо не можам атрымаць лёгкі доступ да прэфрантальнай кары мозга. А гэтая зона якраз адказвае за найвышэйшую разумовую дзейнасць накшталт планавання, арганізацыі і логікі. Таму ў стрэсе разумныя людзі прымаюць дурныя рашэнні».

Згубна адбіваецца і неабходнасць усё рабіць хутка. Чалавек карыстаецца калькулятарам, а мог бы самы просты прыклад рашыць у галаве. Электронныя карты падрываюць навігацыйныя навыкі мозга. Больш за тое, тэхналогіі негатыўна адбіліся на сацыяльных навыках і супераджыванні. У выніку людзі цяпер лёгка пазбягаюць непрыемных размоў. Каб мозг працаваў паўнавартасна, трэба пастаянна вучыцца, дастаткова спаць і мінімізаваць стрэс. Таксама карысна зменшыць тэмп жыцця, навучыцца выслухоўваць людзей і спакойна выконваць заданні.



КАРОТКА

Эскізны праект помніка Настассі Слуцкай беларускага скульптара Сяргея Аганава названы пераможцам конкурсу. Аўтар атрымаў права стварэння помніка, які будзе ўстаноўлены ў горадзе Слуцку ў 2016 годзе да 900-годдзя горада.

Кошт адной паездкі ў мінскім метро з 24 снежня складзе Br5,5 тыс.

Беларусь у студзені—кастрычніку 2015 года павялічыла імпарт сырой нафты на 1,5%, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года да 18,7 млн т.

Дзяржаўная лясная ахова напярэдадні калядных і навагодніх свят перайшла на ўзмоцнены рэжым аховы лясоў для прадухілення незаконных высечак хвойных дрэў.

Больш як 40 каналаў незаконнай транзітнай міграцыі выявілі і спынілі беларускія пагранічнікі з пачатку 2015 года. Затрымана 70 арганізатараў такой міграцыі.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

КАЛІ НЕ ЧУЕШ, ЯК ШАЛЯСЦЯЦЬ СТАРОНКІ, ТО І ЧЫТАЦЬ НЕЦІКАВА

Ніна МАКСІМУК, настаўніца беларускай мовы і літаратуры (ужо на пенсіі), в. Хаціслаў, Маларыцкага раёна:

— «Звязду» выпісваю ўжо больш за дзесяць гадоў, бо гэта родная газета на роднай мове... Калі яшчэ працавала ў школе настаўніцай беларускай мовы і літаратуры, яна была для мяне добрым памочнікам. Паколькі тады друкаваўся Янка Крук. У мяне цэлы «дзённік» сабраны з яго матэрыяламі. Па фальклоры шмат усяго знаходзіла. І дагэтуль з інтарэсам чытаю «Ігуменскі тракт» і ўсе публікацыі, якія расказваюць пра нашу гісторыю.

У газеце мне падабаецца ўсё, таму што ў кожным нумары можна знайсці матэрыялы на любы густ. У той жа «Крынічцы» заўсёды сустрэнеш слушныя парады. Калі патрэбна нейкая інфармацыя па тэме адукацыі, то ў «Звяздзе» яе ўбачыш раней, чым яна з'явіцца ў іншых, нават спецыялізаваных, выданнях. Заўсёды цікава чытаць калонкі Алены Ляўковіч і матэрыялы карэспандэнта па Брэсцкай вобласці Святланы Яскевіч. Чакаю кожны новы выхад «Простай мовы» Валянціны Доўнар. А калі бачу матэрыялы Ларысы Цімошык, то ведаю, што абавязкова прачытаю добры артыкул пра культуру. Вельмі карысны дадатак з'явіўся — «Сямейная газета».

Чытаем газету разам з мужам. Здараецца, можам нават паспрачацца, хто возьме новы нумар у рукі першым. Альбо я прапушчу ці не заўважу нешта, а ён мне падкажа, бо прачытвае «Звязду» ад коркі да коркі. Неяк атрымалася так, што не выпісалі любімую газету, і тады сапраўды было адчуванне, быццам нечага ў доме не хапае. Ведаеце, зараз многія гавораць пра знікненне папяровай кнігі. Але мне здаецца, калі не чуеш, як шаляцяць старонкі, то і чытаць нецікава. І з газетай тое ж.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I паўгоддзе 2016 года!

5 разоў на тыдзень!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

ГАЛОЎНАЕ — ІНТАРЭСЫ ЛЮДЗЕЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

МАЛАШАНКІ Міхаіла Пятровіча — намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі — дырэктарам Дэпартамента па энергаэфектыўнасці;

ЗАВАЛЕЯ Ігара Уладзіміравіча — членам Гомельскага аблвыканкама;

ІГНАТАВА Паўла Уладзіміравіча — членам Мінскага аблвыканкама;

СТАДОЛЬНІКА Валерыя Францавіча — членам Мінскага аблвыканкама.

Аляксандр Лукашэнка даручыў новаму памочніку Прэзідэнта Беларусі — галоўнаму інспектару па Віцебскай вобласці Аляксандру Пазняку сумесна з губернатарам стварыць нармальны рэзерв кадраў, на якія ім у далейшым давядзецца абапірацца ў вобласці.

«Праблем у Віцебскай вобласці дастаткова, і некаторыя з іх маюць хранічны характар, яны не першы год ёсць, пэўныя яшчэ з савецкіх часоў», — лічыць Прэзідэнт. «Што датычыцца кадраў, тут у вас павінна быць уласнае меркаванне. Таму што вы яшчэ і інспектар па Віцебскай вобласці, інспектуеце ўсё і ўся, што знаходзіцца ў рэгіёне, з'яўляецеся вачамі і вушамі Прэзідэнта», — сказаў ён.

Назначаючы Аляксандра Гур'янава паслом у Італіі, Прэзідэнт заявіў: «У будучым годзе Міністэрства замежных спраў павінна займацца амаль толькі знешнеэканамічнай дзейнасцю, а дакладней — знешнім гандлем».

У ходзе прызначэння Віктара Клімава пракурорам Брэсцкай вобласці кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Вы ні ў якім разе не павінны ні пад каго прагінацца. Рэгіён вельмі няпросты, асабліва з улікам таго, што граніца праходзіць. Я вас вельмі прашу ні з кім не канфліктаваць, дапамагаць губернатару: адну справу робіце. Але прынцыповасць — галоўнае».

Кадравыя перастаноўкі адбыліся таксама ў Віцебску — узгоднена назначэнне новага намесніка аблвыканкама і старшыні райвыканкама. Прэзідэнту расказалі, што цяпер у вобласці праводзіцца эксперымент па стварэнні інтэграванага сельгасаб'яднання, у якое ўключаны свінагадоўчыя і птушкакомплексы, а таксама перапрацоўчыя прадпрыемствы. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўсё неабходна грунтоўна падлічыць, каб была максімальная эфектыўнасць ад такіх новаўвядзенняў. Ён таксама асаблівую ўвагу надаў пытанням дысцыпліны і парадку: «Без дысцыпліны і парадку нічога не зробіце. Не будзе жалезнага парадку, не будзе толку».

Прызначаючы кіраўнікоў мясцовай вертыкалі ўлады, Прэзідэнт падкрэсліў: «І яшчэ адно пытанне якраз на злобу дня, якое мяне хвалюе: вельмі шмат падначаленых, прыйшоўшы на гэтую пасаду (хоць я вас папярэджваю, што вы на перадавой, твар у твар з людзьмі), пачынаюць паляпшаць свае жыллёвыя ўмовы. Я не супраць, але — за ваш уласны кошт». Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што «вельмі шмат старшынь райвыканкамаў на гэтым пагарэлі».

Ён таксама папярэдзіў: «Калі вы ідзяце на гэтую пасаду, вы павінны ведаць, што, як на шкле, прасвечваецеся з усіх бакоў і людзі вас бачаць. Наступны год будзе вельмі складаным, заўважу, што такога года ў гісторыі нашай краіны не было. Абвалілася Расія, што робіцца ва Украіне (а гэта наш другі рынак), Казахстан прасеў. І нам трэба проста выстаяць. Калі мы будзем працаваць, не рэагуючы на людзей, іх прапановы, заўвагі, не падтрымліваючы іх, а ствараючы сваё матэрыяльнае становішча, то такая ўлада народу не патрэбна».

Прэзідэнт падкрэсліў, што ва ўсіх дакладна вызначаны зоны адказнасці і трэба ў адпаведнасці з гэтым працаваць, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Але інтарэсы людзей — самае галоўнае ў рабоце чыноўнікаў. Людзі павінны мець магчымасць працаваць і зарабляць.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што да прадстаўнікоў улады і ў далейшым будуць выстаўляцца самыя высокія патрабаванні.

САЦЫЯЛЬНАЯ МАДЭЛЬ ДЗЯРЖАВЫ ЗАСТАНЕЦЦА НЯЗМЕННАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся таксама, якія даручэнні засталіся не выкананымі пасля VII з'езда Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ўсё, што было абяцана на з'ездзе, неабходна рэалізаваць.

Міхаіл Орда сказаў, што ўдалося вырашыць многія пытанні, якія хвалююць працоўных.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў цэнтры ўвагі павінна заставацца сацыяльная абарона людзей, а таму дзяржаўная сацыяльная мадэль застаецца нязменнай. Агульная задача і органаў дзяржаўнага кіравання, і прафсаюзаў — гэта захаванне рабочых месцаў, сацыяльна-прававая абарона працоўных.

Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны, што Федэрацыя прафсаюзаў бачыць тэндэнцыю скарачэння работнікаў, непрадаўжэння кантрактаў і змяншэння колькасці вакансій. У сувязі з гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што так быць не павінна.

ФПБ унесла прапанову аб удасканаленні заканадаўства ў пытанні, калі прадпрыемства падпадае пад санацыі і работнікам няма каму плаціць кампенсацыі. У прыватнасці, прапануецца разгледзець пытанне аб стварэнні кампенсацыйнага фонду, з якога можна было б выплачваць работнікам кампенсацыі ў выпадку, калі на прадпрыемстве няма чаго прадаваць і няма фінансавых сродкаў для выплат.

Акрамя таго, Федэрацыя прафсаюзаў прапануе максімальна пашырыць рынак страхавых паслуг на выпадак беспрацоўя.

Прэзідэнт таксама праінфармаваны аб сітуацыі на найстарэйшым прадпрыемстве краіны «Магілёўскі завод «Строммашына». Тут назбіралася вялікая колькасць даўгоў, што не дае яму выйсці на бясстратную вытворчасць. Кіраўніку дзяржавы перададзена просьба дапамагчы калектыву прадпрыемства з заказамі, што дасць магчымасць заводу палепшыць фінансавы стан і выйсці на ўстойлівую работу.

Размова ішла таксама аб сітуацыі на шэрагу іншых прадпрыемстваў. Прэзідэнт даў адпаведныя даручэнні, якія Федэрацыя прафсаюзаў будзе выконваць сумесна з урадам.

■ Тры пытанні да ўлады

МОСТ, ДАРОГА, ГАЗІФІКАЦЫЯ, КААПЕРАЦЫЯ

Пры падвядзенні вынікаў работы народнагаспадарчага комплексу Брэстчыны за 10 месяцаў адзначалася, што па аб'ёме падрадных будаўнічых работ адзіны раён у вобласці — Жабінкаўскі — перавысіў леташнія паказчыкі. Гэта значыць, паказчыкі не знізілі: наадварот, пабудавалі больш, чым у папярэднім годзе. Напрыклад, у раёне з пачатку года ўвялі ў строй 15,9 тысячы квадратных метраў жылля пры плане 10,5 тысячы. Названыя факты і сталі нагодай, каб задаць некалькі пытанняў намесніку старшыні Жабінкаўскага райвыканкама па будаўніцтве Анатолю ШАЛТАНЮКУ.

— Апошнім часам і на «прамых лініях» з кіраўніцтвам вобласці, і на асабістых прыёмах людзі ўздымаюць шмат пытанняў па газіфікацыі населеных пунктаў...

— Тое, што вяскоўцы непакояцца пра газавыя сеткі, тэлефануюць, пішуць пісьмы, цалкам зразумела. Газ у доме — гэта цяпло, камфорт, адным словам, умовы жыцця, набліжаныя да гарадскіх. Сем з васьмі аграгарадкоў нашага самага малога раёна краіны ўжо маюць газавыя камунікацыі. У плане на будучы год пазначана пракладка падводзячых сетак да аграгарадка Вялікія Якаўчыцы. Калі газ прыйдзе і ў названы населены пункт, тады можна будзе гаварыць, што ўсе аграгарадкі адпавядаюць свайму статусу.

Шмат чаго зроблена і ў гэтым годзе. Так званы падводзячы газаправод пракладзены да аграгарадка Крыўляны, а таксама вёсак Агароднікі і Вешкі СВК «Вазнясенскі». Як вядома, падводзячыя сеткі будуюцца за кошт бюджэту. І хоць спачатку вёскі Рачкі ў плане не было, жыхары гэтага населенага пункта захацелі мець газ у сябе і правялі работу па зборы грошай. Праўда, яны скааператываліся з гаспадарамі двух дачных пасёлкаў, што размешчаны недалёка ад іх вёскі. І ў складчыну працягнулі «нітку» Збірагі-Рачкі. Як бачым, ініцыятыва і жаданне мясцовых жыхароў у справе газіфікацыі адыгрываюць не апошнюю ролю. Будаўніцтва часам адбываецца не так хутка, як нам хацелася б, праз недахоп фінансавання. А кааперацыя якраз бывае выйсцем на гэтым шляху.

Як ужо гаварылася, падводзячы газаправод робіцца за кошт бюджэту. А вулічныя сеткі, паводле 368-га ўказа, фінансуюцца ў прапорцыі 70 на 30. Гэта значыць: 70 працэнтаў кошту бярэ на сябе бюджэт, а 30 працэнтаў дабаўляе насельніцтва. Дык вось у гэтым годзе мы праклалі вулічныя сеткі у вёсках Сакалова, Шпіталі і Сцяпанкі. Зараз на стадыі завяршэння знаходзіцца распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі па вулічных сетках вёсак Крыўляны, Вешкі і Сакі. Але пакуль што грошы выдзелены на наступны год толькі на газаправод вёскі Сакі. Так што, магчыма, Крыўлянам і Вешкам давядзецца яшчэ чакаць.

— Згадзіцеся, Анатоль Вітальевіч, першая прыкмета цывілізаванасці асобнага рэгіёна, а то і краіны, — стан дарог. Што зроблена за год у плане дарожнага будаўніцтва?

— З пачатку года ў раёне пракладзена амаль пяць кіламетраў асфальтаваных дарог, на што затрачана 9,2 мільярда рублёў. У выніку цэнтральная сядзіба СВК «Арэпічы» цяпер мае добрую дарогу да райцэнтра, пракладзены асфальт паміж вёскамі Старое Сяло і Азяты. Распачата будаўніцтва цвёрдага пакрыцця на дарозе да Вялікіх Якаўчыц.

— Сёлета на ўсіх узроўнях многа гаварылася пра Жабінку як горад-спадарожнік Брэста. Рашэнне такое прынята. Можа, ужо нешта робіцца па развіцці менавіта горада-спадарожніка?

— Генеральны план развіцця горада-спадарожніка сфарміраваны, але канчаткова не зацверджаны, таму мы пакуль гаворым пра праект гэтага плана. Усе яго пункты ўзгоднены, і мы ведаем, што Жабінка будзе прырастаць новымі мікрараёнамі ў бок сённяшняй свабоднай эканамічнай зоны, мясцовыя жыхары сказалі б «на той бок ракі». І галоўным аб'ектам у гэтым кірунку бачыцца мост, які не так даўно ўведзены ў строй. Мост цераз раку Мухавец на аўтадарозе Р7 Камянец — Федзькавічы ўзвялі замест старога, які вычарпаў свой рэсурс і стаў аварыйным. Новы пабудавалі за два гады. Цяпер на ажыўленай трасе, якая злучае два раёны — Камянецкі і Жабінкаўскі — з'явіўся прыгожы сучасны мост. Ён і стаў першай значнай прыступкай на шляху да горада-спадарожніка.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

НА ЧЫГУНЦЫ — НОВЫЯ ТАРЫФЫ

У краіне ўстаноўлены новыя тарыфы на перавозкі пасажыраў чыгуначным транспартам агульнага карыстання на гарадскіх, рэгіянальных і міжрэгіянальных лініях.

У прыватнасці, кошт праезду пасажыраў цягнікамі на гарадскіх лініях у межах тарыфнага пояса ўстаноўлены ў памеры 8,8 тысячы рублёў. Па такім кошце можна дабрацца, напрыклад, ад станцыі Мінск-Пасажырскі да станцый Беларусь, Гарадзішча, Фаніпаль, Міханавічы або ад станцыі Брэст-Цэнтральны да Жабінкі. Тарыф на перавозкі пасажыраў у межах двух тарыфных паясоў па адным напрамку (маршруце) складзе 10,4 тысячы рублёў. Столькі будзе каштаваць паездка, скажам, ад станцыі Мінск-Пасажырскі да станцыі Смалявічы пры праездзе праз станцыю Гарадзішча. Кошт перавозкі ў межах двух тарыфных паясоў па двух напрамках складзе 17,6 тысячы рублёў. Столькі будзе каштаваць паездка ад станцыі Беларусь да станцыі Фаніпаль пры праездзе праз станцыю Мінск-Пасажырскі.

На рэгіянальных лініях эканомкласа тарыф на перавозкі пасажыраў за адну зону праезду складзе 1,6 тысячы рублёў, за адзін кіламетр праезду — 160 рублёў.

Апроч таго, устаноўлены кошт перавозкі багажу і грузабагажу на гарадскіх, рэгіянальных і міжрэгіянальных лініях. Так, цана дастаўкі багажу ў залежнасці ад адлегласці і масы вырасце на 33 працэнты, а з абвешчанай каштоўнасцю, якая бярэцца дадаткова да тарыфаў на перавозку багажу, — ад 25 да 33 працэнтаў.

Пастанова ўступае ў сілу праз тры дні пасля афіцыйнага апублікавання.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Еўразійская прастора

СТАРШЫНСТВА Ў ЕАЭС ПЕРАДАДЗЕНА КАЗАХСТАНУ

У 2016 годзе Казахстан прымае ад Беларусі старшынства ў Еўразійскім эканамічным саюзе. Адпаведнае рашэнне было падпісана падчас пасяджэння Найвышэйшага эканамічнага савета ЕАЭС на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў, якое адбылося ў Маскве 21 снежня. Акрамя гэтага, падчас пасяджэння савета былі абмеркаваны іншыя актуальныя для ЕАЭС пытанні.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас саміту выказаў заклапочанасць у сувязі з новымі ўмовамі гандлю паміж Еўрасаюзам і Украінай.

— Вы ведаеце, што з 1 студзеня будучага года пачынае дзейнічаць пагадненне аб зоне свабоднага гандлю паміж Украінай і Еўрапейскім саюзам, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Складаецца сур'ёзная сітуацыя ў адносінах да зоны свабоднага гандлю СНД. Не толькі ў Расіі, але ва ўсіх нас ёсць пэўная заклапочанасць з гэтай нагоды. Расійская Федэрацыя вяла перамовы з Еўрасаюзам на названую тэму. Як сёння далажыў віцэ-прэм'ер Шувалаў, ні пра што пакуль не дамовіліся і ёсць боязь, што і размовы больш не будзе да 1 студзеня. Ды ўжо і часу няма: яны ж усе на канікулы сыходзяць, а потым і мы ўслед за імі. Таму можа скласціся сітуацыя, калі тавар Украіны будзе замешчаны таварам Еўрасаюза ва Украіне, а іх тавар хлыне на нашу тэрыторыю. Або яшчэ больш, у нас асцярога, што тавар Еўрасаюза, па нулявой пошліне трапіўшы ва Украіну, калі мы не абараняемся, па зоне свабоднага гандлю СНД трапляе на тэрыторыю ўсёй Садружнасці.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што Прэзідэнт Расіі падпісаў указ, які прадугледжвае меры абароны расійскага рынку, і паведаміў, што лідары краін ЕАЭС прынялі рашэнне на працягу першага квартала вывучаць сітуацыю цягам паўгода перайсці на электроннае дэклараванне тавараў, якія будуць перамяшчацца ў межах ЕАЭС.

«Прыклад гэтаму ёсць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Электроннае дэклараванне паміж Беларуссю і Расіяй. Як прапанаваў Ігар Шувалаў, мы можам узяць гэты варыянт або выпрацаваць нейкі новы. За паўгода мы разгледзім гэтыя варыянты».

Пра тое, што будучы год будзе няпростым, казаў і Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў. «Мы надаём выключна важнае значэнне дзейнасці Еўразійскага эканамічнага саюза, які мае вялікі патэнцыял для развіцця нашых краін, — сказаў ён, прымаючы эстафету старшынства ў ЕАЭС ад беларускага Прэзідэнта. — З улікам нестабільнасці сусветнай эканамічнай кан'юнктуры мы разумеем, што 2016 год будзе складаным і нам давядзецца працаваць у асаблівых умовах».

Прэзідэнт Казахстана адзначыў, што яго краіна падчас свайго старшынства надасць павышаную ўвагу пытанням стварэння зоны свабоднага гандлю паміж ЕАЭС і Шанхайскай арганізацыяй супрацоўніцтва, а таксама развіцця эканамічнага супрацоўніцтва з Кітаем.

Пытанне аб спалучэнні ЕАЭС і эканамічнага пояса Шаўковага шляху стала асобнай тэмай на саміце. Старшыня Еўразійскай эканамічнай камісіі Віктар Хрысценка паведаміў журналістам, што па выніках першага паўгоддзя ЕЭК плануе пачаць работу па канчатковым узгадненні дарожнай карты спалучэння двух праектаў не толькі паміж краінамі — членамі саюза, але і з кітайскімі партнёрамі, каб у трэцім квартале наступнага года яна ўжо магла быць зацверджана.

Прамысловая і аграпрамысловая сферы, фінансавая, транспартная і інфармацыйная інфраструктуры названы прыярытэтнымі для супрацоўніцтва з КНР у рамках эканамічнага пояса Шаўковага шляху. «Сумесна з урадамі краін саюза вядзецца работа па падборы праектаў. Яны складуць аснову дарожнай карты», — паведаміў Віктар Хрысценка.

Апроч іншага, лідары краін ЕАЭС на маскоўскім саміце зацвердзілі новы склад Еўразійскай эканамічнай камісіі, у які ўвойдуць дзесяць чалавек: па два прадстаўнікі ад кожнай з пяці краін — удзельніц ЕАЭС.

Новы склад Калегіі ЕЭК пачне выкананне абавязкаў з 1 лютага 2016 года. Сам Віктар Хрысценка з 1 лютага складзе паўнамоцтвы яе старшыні: на папярэднім саміце прэзідэнты ЕАЭС зацвердзілі на гэтай пасадзе былога прэм'ер-міністра Арменіі Тыграна Саркісяна.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

Кнігі як цуд

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Узяў пачатак міжнародны сімпозіум «Пісьменнік і Час», які ўпершыню сабраў удзельнікаў з розных краін свету ў лютым, падчас Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. 2015-ы стаў годам заснавання Нацыянальнай літаратурнай прэміі, гэта пацвярджае вялікі клопат дзяржавы пра развіццё нашай літаратуры, кнігавыдання. Святлана Алексіевіч атрымала Нобелеўскую прэмію — гэта таксама знакавы момант для беларускай літаратуры.

Адметнай падзеяй года можна назваць і пачатак акцыі «Сямейнае чытанне», што праводзіцца сумесна з Беларускім саюзам жанчын і будзе доўжыцца да мая 2016 года. Гэты праект закліканы яшчэ раз нагадаць, як важна ў коле сям'і, сяброў, блізкіх знаходзіць час для кнігі. Літаратурныя творы, прачытаныя разам, могуць стаць выдатнай тэмай для агульнай цёплай гутаркі. Міністр працы і сацыяльнай абароны, старшыня Беларускага саюза жанчын Марыяна Шчоткіна заўважыла:

— На жаль, ёсць дзеці, якім мама ніколі не чытала кнігі, якія былі пазбаўлены гэтага шчасця матулінай ласкі, дабрыні і цеплыні казак, апавяданняў, гісторый. Сёння кожны з нас мае магчымасць падарыць такім дзеткам цяпло, паказаць сваю спагаду і неабыякавасць.

15 унікальных кніжных праектаў, аб'яднаныя ў 7 тэматычных блокаў, сталі лотамі дабрачыннага аўкцыёну. І калі на ранейшых святах самымі эксклюзіўнымі і каштоўнымі былі рарытэты з прыватных калекцый, выданні, якіх ужо даўно няма ў продажы, то сёлета рарытэты саступілі па папулярнасці кнігам, што яшчэ рыхтуюцца да шырокага выпуску і выдадзены толькі ў адзінкавых копіях. Падчас аўкцыёну сваіх першых чытачоў і ўладальнікаў знайшлі кнігі, якія, безумоўна, стануць хітамі наступнага года. Гэта выданне «Гонар Беларусі. Маладыя, таленавітыя, адораныя», падрыхтаванае выдавецтвам «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» як своеасаблівы вынік Года моладзі. Кніга распавядае пра лаўрэатаў і стыпендыятаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, а таксама адораных навучэнцаў і студэнтаў.

Фота Кастуся ДРОБАВА.

Першы асобнік выдання «Слуцкія паясы. Мастацтва, асобы, эпоха» (выдавецтва «Беларусь») таксама знайшоў свайго чытача. Самы дарагі лот аўкцыёну, які пайшоў з малатка за 9,5 мільёна рублёў, — таксама першы экзэмпляр. Гэта кніга «Уладзімір Мулявін. «Сэрцам і думамі...», падрыхтаваная выдавецтвам «Мастацкая літаратура» пад заслону года. Пад вокладкай фаліянта сваімі ўспамінамі пра выдатнага музыканта, стваральніка і кіраўніка легендарнага гурта «Песняры», народнага артыста СССР Уладзіміра Мулявіна дзеляцца яго сябры і калегі. Выданне вельмі дарэчы — 12 студзеня Уладзіміру Мулявіну споўнілася б 75...

За адважны ўчынак таварыства выратавання на вадзе ўзнагародзіць яго граматай і каштоўным падарункам.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

ТАЛАКОЙ КАПЛІЦУ ЗРОБІМ

Жыхары вёскі Жмурное ў Лельчыцкім раёне будуюць капліцу з прыгожай чырвонай цэглы. Гэтая будоўля стала справай гонару для мясцовых жыхароў.

Да Вялікай Айчыннай вайны тут быў невялікі храм, аднак, як і многія культавыя збудаванні, яго адвялі пад краму. Крама хутка згарэла, а пра існаванне царквы нагадвала толькі цудам ацалелае дрэва, на якім калісьці вісеў звон. Ініцыятарамі аднаўлення хрысціянскай святыні стала сям'я Ніны і Мікалая Касінскіх, якія страцілі свайго сына. На іх заклік адгукнуліся не толькі аднавяскоўцы, але і выхадцы з тутэйшых мясцін. На першыя ахвяраванні заклалі падмурак, а з вераснем мінулага года пачаліся інтэнсіўныя работы. Агульная справа згуртавала аднавяскоўцаў. Нават самыя пажылыя жыхары Жмурнога, нягледзячы на свой узрост, дапамагаюць у будаўніцтве не толькі грашыма, але і фізічна. Некаторыя робяць адліўкі на будаўніцтва з кожнай пенсіі. Работы набліжаюцца да завяршэння, і асвячэнне новай капліцы плануецца на пачатак лютага 2016 года.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

ПАПРАВІЦЬ КРАН ДАПАМОЖА... ПРЫНТАР

Урач з Ліды распрацаваў 3D-прынтар, які прадставіў на абласной выставе-прэзентацыі рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі».

Не засталіся без увагі і юбіляры 2015 года. Так, на аўкцыёне былі прадстаўлены кнігі Уладзіміра Караткевіча «Ладдзя Роспачы» і «Дзікае паляванне караля Стаха», мемуары выдатнага кампазітара і дыпламата Міхала Клеафаса Агінскага і даследаванні яго нашчадкаў, перакладзеныя з французскай мовы (праект выдавецтва «Чатыры чвэрці»), выданне «Аляксей Кузьміч. Творца ўзвышаных Мадонн», прысвечанае памяці выдатнага мастака. Адзначылі і вялікі юбілей, які чакае нас у 2017-м, — 500-годдзе беларускага кнігадрукавання. Былі прадстаўлены: рарытэтная энцыклапедыя «Францыск Скарына і яго час», эксклюзіўны праект «Скарынаўскі каляндар», а таксама кніга «Францыск Скарына на мовах народаў свету», падрыхтаваная летась Выдавецкім домам «Звязда».

Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што з гадамі гэтыя кнігі здабудуць яшчэ большую каштоўнасць.

Калядны кніжны баль яшчэ раз даказаў: сёлета выдаўцамі рэалізавана сапраўды шмат знакавых праектаў, але і наступны год абяцае быць не менш цікавым і паспяховым. З кнігай, здольнай тварыць дабро, несці розум і асвету, сапраўды ўсё магчыма.

Падчас аўкцыёну сёлета было сабрана 68 мільёнаў рублёў, гэтыя грошы дапамогуць здзейсніць запаветныя жаданні выхаванцаў Журавіцкага дома-інтэрната. Дзякуючы добрай кнізе адбываюцца цуды!

Марына ВЕСЯЛУХА.

ЗВЯЗДА *Да чытача з любоўю!*

■ Мы едзем да вас

ДА СУСТРЭЧЫ!..

Часам у нас, журналістаў, пытаюцца, маючы на ўвазе рэдакцыйныя выезды на тое ці іншае прадпрыемства: «А навошта вам гэта трэба?» Навошта траціць грошы на камандзіроўкі, ахвяраваць сваім часам, адрываць людзей ад спраў? Маўляў, ёсць жа інтэрнэт, і калі чалавек захоча больш даведацца пра «Звязду», ён можа проста націснуць на патрэбную клавішу...

Нехта мяркуе так. Але мы лічым інакш. Мы ўпэўнены: сёння любой арганізацыі, у тым ліку і сродкам масавай інфармацыі, калі яны хочуць будаваць трывалыя і доўгатэрміновыя адносіны са сваімі кліентамі (чытачамі), неабходна быць максімальна празрыстымі і адкрытымі. А гэта дасягаецца толькі праз непасрэдны кантакт, праз дыялог. Менавіта ён дапамагае наладзіць найлепшыя стасункі — як на палітычнай арэне, так і на арэне паўсядзённага жыцця.

Таму мы шчыра дзякуем кіраўніцтву і работнікам адкрытага акцыянернага таварыства «Нафтан», якія на мінулым тыдні прыйшлі на сустрэчу з прадстаўнікамі газеты «Звязда». Прыйшлі, спадзяёмся, не проста «дзеля птушачкі», бо дыялог атрымаўся вельмі цікавым і паказальным, прынамсі для нас, звяздоўцаў. Цяпер мы ведаем, што на «Нафтане» працуюць людзі, неабыякавыя да лёсу беларускай культуры і мовы: ім не ўсё роўна, на якой мове пішуцца ўказальнікі ў родным горадзе і ў сталіцы; яны цікавяцца творчасцю Святланы Алексіевіч і імкнуцца разабрацца ў «нацыянальнай прыналежнасці» яе літаратурнай спадчыны; іх хвалюе, дзе захоўваюцца ваенныя нумары «Звязды» і якім чынам увекавечана памяць герояў, што яе выпускалі; яны прапануюць да 100-годдзя газеты, якое будзе адзначацца зусім хутка, у 2017-м, падрыхтаваць спецвыпускі з укладкамі-фотакопіямі самых першых яе нумароў; яны пытаюцца, як прывіць дзецям і дарослым любоў да мовы...

Апошняе пытанне, дарэчы, нам задавалі не толькі на «Нафтане», але і падчас іншых — шматлікіх — паездак і сустрэч. Адказ, напэўна, ляжыць на паверхні. Трэба паважліва ставіцца да сваёй краіны і яе традыцый, не саромецца як мага часцей размаўляць па-беларуску, чытаць дзецям казкі, набываць кніжкі на роднай мове, ну і, вядома, выпісваць «Звязду». Яна — сапраўды зразумелая, блізкая і родная — дапаможа пераадолець і моўныя, і, спадзяёмся, усялякія іншыя бар'еры.

Дзякуй за цёплы прыём, Навапалацк! І — да сустрэчы!

Наталля КАРПЕНКА. *karpenka@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ЯКОЕ СВЯТА БЕЗ ПАДАРУНКАЎ?

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў пабываў на навагоднім святе ў цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, дзе ў рамках дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» ўручыў сертыфікат на суму 25 мільёнаў рублёў і салодкія падарункі кожнаму выхаванцу.

Гэты цэнтр працуе ў Гродне 17 гадоў, дапамагаючы дзецям з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Уладзімір Краўцоў адзначыў, што ў дабрачынную акцыю «Нашы дзеці» разам з прадстаўнікамі органаў улады актыўна ўключыліся прадпрыемствы і арганізацыі вобласці. Напярэдадні самых любімых дзецьмі свят яны пабываюць з падарункамі і пачастункамі ва ўсіх установах спецыяльнай адукацыі, інтэрнатах і дзіцячых дамах. Акрамя таго, у гэтыя святочныя дні адкрыюцца новыя аб'екты — дзіцячы садок у мікрараёне Вішнявец абласнога цэнтра і дом сямейнага тыпу ў Астравецкім раёне.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

«СВОЙ ХЛОПЕЦ» У БРОНЗЕ

Помнік народнаму куміру 30-40-х гадоў мінулага стагоддзя Пятру Алейнікаву з'явіўся ў цэнтры Шклова. Ураджэнец тутэйшай вёскі Крывель праслаviў свой край тым, што стаў адным з самых яскравых артыстаў савецкага перыяду. Ён зняўся ў болей чым 40 фільмах, найбольш вядомымі з якіх сталі «Трактарысты», «Вялікае жыццё», «Сямёра смелых».

Нават стаўшы знакамітым, ён заставаўся «сваім хлопцам». Прыязджаў да землякоў у госці, рабіў ім падарункі... Артыст пайшоў з жыцця ва ўзросце ўсяго толькі 50 гадоў, пахаваны на Новадзявочых могілках у Маскве.

— Помнік нашаму таленавітаму земляку ўсталяваны за спонсарскія сродкі неабыякавых людзей, — паведаміў **намеснік старшыні Шклоўскага райвыканкама Вадзім РАГАВЫ.** — Для нашага горада гэта вялікі падарунак, бо мы робім усё, каб зберагчы традыцыі краю і ўвекавечыць тых, хто праславіў шклоўскую зямлю.

Гэта не адзіны знак павагі вядомаму земляку. Адна з вуліц Шклова носіць імя артыста, а на малой радзіме Алейнікава, у Крывелі, працуе музей, куды кожны год на дзень яго народзінаў з'язджаюцца прыхільнікі з усіх бакоў свету.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

НЕ ПРАЕХАЎ МІМА

У аграгарадку Ціхінічы Рагачоўскага раёна мясцовы жыхар Аляксандр Бялоўскі на сваім аўто праязджаў міма школьнікаў, якія гулялі на самым беразе сажалкі і каталіся па першым крохкім лёдзе. Мужчыну здзівіла, што побач няма дарослых, і ён спыніўся, каб папярэдзіць дзяцей. Між тым глыбіня вадаёма ўжо ў трох-чатырох кроках ад берага дасягае двух метраў.

Калі мужчына падышоў да дзяцей, ён заўважыў, што адзін хлопчык ужо выбег на лёд і амаль адразу праваліўся ў ваду. Ён паспеў схапіцца за край крыгі, але намоклая адзежа цягнула ўніз. 41-гадовы Аляксандр кінуўся да дзіцяці, аднак праваліўся сам. Ён паплыў да васьмігадовага хлапчука, ламаючы лёд рукамі, паспеў дабрацца да дзіцяці і выцягнуць яго на бераг. Выратаваўшы, ён пазнаў школьніка і адвёз яго дадому, дзе маці ўжо пераапранула і адагрэла дзіця. Мужчына працуе кіроўцам на Рагачоўскім малочна-кансервавым камбінаце.

ПЕТР КІЗІК ПРАЦУЕ Ў ЛІДСКАЙ ЦЭНТРАЛЬНАЙ РАЁННАЙ БАЛЬНІЦЫ

Лідскі вынаходнік — не адзіны, хто прадставіць Гродзеншчыну на рэспубліканскім этапе конкурсу. Пераможцамі таксама прызнаны праект па выкарыстанні адходаў шкляной прамысловасці ў вытворчасці даўгавечнай і яркай дарожнай разметкі, праект партатыўнай зараднай прылады, сабранай з камп'ютарнага металалому, ідэя вытворчасці ў Гродне пластыкавых рашотак для стварэння экапарковак на газонах. Усяго моладзь рэгіёна прадэманстравала на конкурсе каля 20 праектаў у васьмі намінацыях.

— Радуе шырокая геаграфія прадстаўленых праектаў, — гаворыць **другі сакратар Гродзенскага абласнога камітэта БРСМ Дзяніс ЧАРНЯК.** — Некаторымі ідэямі і інавацыямі ўжо зацікавіліся прадстаўнікі бізнесу.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

23 снежня 2015 г.
№ 24 (364)

ЯШЧЭ НЕ ВЕЧАР

«КАЛІ ЛЮДЗЕЙ НА ПРЫЁМЕ НЯМА, ІДУ ДА ІХ САМА...»

На прыкладзе Марыны Кравец вучацца працаваць іншыя

Нэлі ЗІГУЛЯ

Марына Андрэеўна — дэпутат яшчэ той, савецкай, загартоўкі і не прывыкла ставіцца да сваёй працы фармальна. У родным Быхаве яе добра ведаюць як чалавека добрасумленнага і адказнага. Заслужаная настаўніца, старшыня раённай арганізацыі ветэранаў, дэпутат райсавета, ганаровая грамадзянка горада Быхава...

Праз некалькі месяцаў ёй спаўняецца 85 гадоў, але Марына Андрэеўна яшчэ дасць фору сваім маладым паплечнікам. Калі на прыём па асабістых пытаннях да яе ніхто не прыходзіць: сама збіраецца і ідзе па адрасах. Летась гэтая няўрымслівая жанчына за сваю актыўную грамадскую дзейнасць атрымала з рук Прэзідэнта ордэн Пашаны. Кажа, што пасля гэтага яна не мае права дрэнна працаваць. І калі будзе трэба і здароўе не падвядзе, паспрабуе прайсці яшчэ на адзін дэпутацкі тэрмін.

14-гадовая брыгадзірка

Па яе лёсе можна вывучаць гісторыю. У шматдзетнай сям'і, дзе яна нарадзілася, выхоўвалася шасцёра дзяцей. Бацька працаваў кіраўніком калгаса «Перамога», а маці была даяркай, прычым ударніцай: у чэрвені 1941 года яна павінна была ехаць у Маскву на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку, але пачалася вайна. Бацька і старэйшая сястра Марыны пайшлі на фронт, яшчэ адна сястра з братам падаліся ў партызаны.

Усеагульная бяда ў адно імгненне зрабіла ўчарашніх дзяцей дарослымі. У страшным 1941-м 10-гадовая Марына засталася ў сям'і за старэйшую. «У нас быў конь, я запрагала яго і разам з 8-гадовай сястрой ехала ў лес па дровы, — дзеліцца яна ўспамінамі пра сваё ваеннае дзяцінства. — Мы знаходзілі забітых, а перад тым, як пахаваць, забіралі ў іх дакументы, складвалі ў скрыні ад кулямётных стужак і закопвалі пад яблыняй дзеда. Даілі карову, паілі параненых малаком».

Аднойчы разам са сваім аднагодкам Марына па загадзе партызан пайшла пад выглядам жабрачкі ў вёску, дзе знаходзіліся немцы. Трэба было прайсці па хатах і падлічыць, колькі варожых салдат там кватаруе. Праз некалькі дзён пасля таго, як яны прынеслі карысныя звесткі ў атрад, немцы былі знішчаны.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

САЦЫЯЛЬНЫ ЗРЭЗ

НА КАГО СПАДЗЯВАЦЦА ПЕНСІЯНЕРУ, калі ўласныя дзеці забываюцца пра яго існаванне

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Праязджаючы летам праз нашы вёскі, можна назіраць адну і тую ж карціну: на лавачках каля сваіх хацін сядзяць старыя, праводзяць поглядам машыны, што праязджаюць міма... Часта да іх ног туляцца коцікі ды сабачкі — верныя істоты, якія ніколі не здрадзяць. І такімі бездапаможнымі, безабароннымі здаюцца гэтыя людзі, што часам сціскаецца сэрца. А калісьці яны працавалі не складаючы рук, трымалі вялікую гаспадарку, сеялі агароды. Але разам са старасцю да іх падкралася адзінота. Так сталася, што хтосьці перажыў мужа ці жонку. У некага дзеці жывуць далёка і не маюць магчымасці часта наведваць бацькоў, а кагосьці нашчадкі проста кінулі, выракліся...

— Пажылыя адзінокія людзі не застануцца адзін на адзін са сваімі бедамі і турботамі, — запэўнівае **дырэктар Крупскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Таццяна ВАРАНОВІЧ.** — Мяркую, пасля таго, як пачнуцца маразы, некаторых вяскоўцаў забяруць да сябе дзеці ды ўнукі. Здараецца і так, што звонім дзецям, каб не забываліся пра бацьку, а яны ў адказ: маўляў, ён мне толькі па дакументах бацька, не даглядаў нас, не гадаваў. Мы яму нічога не павінны.

Адзінокім і ўвогуле няма куды ехаць і каго чакаць. Акрамя сацыяльнага работніка. Ён і вады прынясе з калодзежа, і дроў, і хатнія нарыхтоўкі са склепа дастане, і вокны памые ды заклеіць на зіму, і падворак расчысціць ад снегу.

— Асабліва запатрабаваны ў сельскіх пенсіянераў разавыя паслугі: колка дроў, абкошванне прысядзібных участкаў, садоў, — працягвае Таццяна Міхайлаўна. — Сёлета ў нас сфарміравана комплексная

> “Ва ўстанове ёсць два службовыя аўтамабілі. Дзякуючы гэтаму мабільныя брыгады без праблем могуць выехаць на месца.

брыгада спецыялістаў, якая выязджае ў канкрэтную акругу, сельсавет для аказання дапамогі адзінокім і адзінока пражываючым пенсіянерам, інвалідам I і II груп, што стаяць у нас на абслугоўванні. Але папярэдне мы высвятляем у сацыяльных работнікаў, у чым гэтыя людзі маюць патрэбу. Бяром з сабой і псіхолага, магчыма, спатрэбіцца з кімсьці папрацаваць. Пажылыя — людзі асаблівага складу, не ўсе ахвотна ідуць на кантакт. Мы са спецыялістамі ідзём па хатах, праводзім гутарку па супрацьпажарнай бяспецы, нагадваем, каб акуратна абыходзіліся з агнём, не забыліся ўцяпліць вокны на зіму. Летам, калі была гарачыня, шмат расказвалі, як засцерагчыся ад цеплавога ўдару.

Дарэчы, для адзінокіх, адзінока пражываючых і інвалідаў кошт паслуг цалкам даступны. Напрыклад, гадзіна работы бензінавай касілкі каштуе 35 тысяч рублёў. А за гэты час можна скасіць гектар. Пасекчы 12 кубічных метраў дроў (цэлая машына) — 295 тысяч рублёў. Карыстаюцца попытам і такія паслугі, як пасадка бульбы, агарода, збор вырашчанага ўраджаю...

Цэнтр забяспечаны неабходнай тэхнікай, сельскагаспадарчым інвентаром, прыладамі. За гаспадаркай сочыць спецыяльна абучаны чалавек. Ён адказвае за тэхнічнае абслугоўванне, рамонт, набыццё інструмента. Ва ўстанове ёсць і два службовыя аўтамабілі. Дзякуючы гэтаму мабільныя брыгады без праблем могуць выехаць на месца.

— Сярод старых ёсць людзі, так бы мовіць, з характарам, якім цяжка дагадзіць. Сустракаюцца незадаволеныя? — пацікавілася я.

— Такіх мы не сустракалі, — уступае ў размову **загадчыца аддзялення тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання Ала ГАЙСЁНАК.** — Людзі адчуваюць розніцу паміж сацыяльнымі паслугамі і камерцыйнымі. У прыватнасці, адна з нашых кліентак расказвала, што яе суседка запланіла за колку прычэпа дроў 500 тысяч рублёў, а нашы работнікі спарадкавалі ёй дровы за 200 тысяч.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

Дэпутат Аляксандр ПАЛЯЙЧУК:

«МОЙ ТЭЛЕФОН ДАСТУПНЫ»

Галоўная ўзнагарода за дэпутацкую працу — калі людзі задаволеныя. Так лічыць мой суразмоўца Аляксандр ПАЛЯЙЧУК, дэпутат ад Пінскай сельскай выбарчай акругі №15, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па аграрнай палітыцы.

Парламенцкая школа

— Дэпутатам я вылучаўся яшчэ падчас выбараў у Палату прадстаўнікоў другога склікання, — узгадвае Аляксандр Іванавіч. — Тады зарэгістраваўся кандыдатам ад партыі камуністаў, меў вялікія шанцы. Але ж падумаў, што яшчэ малады, і на апошняй стадыі зняў сваю кандыдатуру. Перад выбарамі дэпутатаў пятага склікання ўжо меў 25-гадовы вопыт кіраўніцтва гаспадаркай. Вырашыў зноў вылучыць сваю кандыдатуру і не памыліўся — людзі мяне падтрымалі.

Мой суразмоўца не шкадуе, што стаў дэпутатам. На яго думку, тут, у парламенце, свая школа.

— У дэпутата Палаты прадстаўнікоў — дзяржаўны ўзровень адказнасці, у дэпутата мясцовага Савета — адказнасць лакальнага ўзроўню, — адзначае суразмоўца. — Але мясцовыя праблемы мы павінны вырашаць разам, не дзяліць, дзе чыё. Галоўнае, каб людзі былі задаволеныя.

Дэпутацкае «хрышчэнне»

Пінская сельская акруга №15 уключае ў сябе ўвесь Пінскі раён (гэта жыхары 170 вёсак), а таксама прыкладна трэцюю частку горада Пінска: новы мікрараён Лугі і стары мікрараён Бяляўшчына.

Акруга, як бачым, немалая, як і сам Пінскі раён, які з'яўляецца адным з найбольш самабытных на Палессі.

— Тут працякае 20 рэк, а таксама Днепра-Бугскі і Агінскі каналы, — расказвае пра сваю малую радзіму Аляксандр Іванавіч. — У нас 9 азёр, 14% тэрыторыі раёна занята балотамі, 37% — лясамі. Палешукі заўсёды радаваліся, калі рэкі ўвесну былі поўныя вады. Гэта азначала, што ў поймах будзе добрая трава — хопіць на два сенакосы, а ў самой рацэ будзе шмат рыбы. Увогуле, Палессе — своеасаблівы рэгіён.

Што да тых пытанняў, з якімі звяртаюцца палешукі, то яны звязаны з жыццём, зразумела.

— Звярталіся да мяне калектыўна шэсць садоўніцкіх таварыстваў з прычыны закрыцця паромнай пераправы, якая была ў аварыйным стане, — узгадвае дэпутат. — Такім чынам, таварыствы аказаліся на розных берагах. Але мне ўдалося ім дапамагчы — звярнуўся ў розныя арганізацыі: адны выдзелілі лесаматэрыялы, другія далі дазвол на пабудову, трэція дапамаглі ўсё пабудаваць. Цяпер пераправа працуе. Гэта было маім дэпутацкім «хрышчэннем». Праблема заключалася і ў тым, што сама пераправа знаходзілася ў Пінскім раёне, а звярнуліся з праблемай дачнікі — гараджане. Не маглі вызначыцца, хто ж павінен вырашыць гэтае пытанне. Я не пісаў ніякіх пісьмаў, займаўся ўсім сам.

Агульная мова

— На працягу першых двух гадоў маёй дэпутацкай працы было шмат зваротаў наконт зменаў графіка руху аўтобусаў — недзе 15. Усе гэтыя пытанні мы абмеркавалі з кіраўніцтвам аўтобуснага парка: я іх зразумеў, яны — мяне. І ў асноўным многія пытанні вырашыліся станоўча, людзі пасля дзякавалі. А для дэпутата гэта самае важнае — калі людзі засталіся задаволенымі вырашэннем сваёй праблемы.

Як і ў іншых акругах, пінчане часцей за ўсё ідуць на прыём да дэпутата, каб дапамог у добраўпарадкаванні вуліц, будаўніцтве вадаправодаў ці каналізацыі.

— Сёлета вельмі актуальным пытаннем падчас прыёмаў было працаўладкаванне, — заўважае суразмоўца, — цяпер гэтая праблема ўжо трошкі «знятая». А так з сакавіка па верасень на прыёмах заўсёды было два-тры чалавекі, якія звярталіся з такой просьбай.

Актуальнымі застаюцца жыллёва-бытавыя пытанні: і ў горадзе, і ў вёсцы. Аляксандр Іванавіч адзначае, што да яго часта звяртаюцца суседзі, якія не могуць вызначыцца з мяжой паміж участкамі.

— Я выязджаў на месца і бачыў, што, як правіла, гэта надуманыя спрэчкі, — расказвае дэпутат. — У такім выпадку стараюся памірыць людзей, пераканаць іх, што трэба жыць мірна.

«Звяртайцеся ў любы час...»

Дэпутат Аляксандр Паляйчук цесна супрацоўнічае з мясцовымі Саветамі.

— За другую палову гэтага года мне давялося пабываць на шасці сесіях сельскіх Саветаў дэпутатаў, — паведаміў Аляксандр Іванавіч. — Практыкаваў выезды ў аддаленыя населеныя пункты — праводзіў там прыёмы грамадзян. Але ў любым выпадку людзі, якія жывуць у аддаленых вёсках, могуць задаць мне свае пытанні па тэлефоне. Увогуле, да мяне можна звярнуцца ў любы час — мой тэлефон даступны, як і тэлефон маіх памочнікаў.

Дэпутат заўважае, што паколькі раён вялікі, то амаль кожны сельскі Савет мае свой стыль, сваю методыку працы, свае праблемныя пытанні, з якімі часта мясцовыя дэпутаты звяртаюцца да калегі з Палаты прадстаўнікоў.

— У адным сельскім Савеце пасля завяршэння сесіі ўзніклі пытанні аб прыёме малака, у другім была праблема з асвятленнем вуліц ноччу... Атрымалася дапамагчы і жыхарам вёскі Парэ, якая ўваходзіць у чарнобыльскую зону і дзе зараз праводзяць газ. Пару чалавек звярнулася ў сельсавет, каб можна было паралельна «ўвесці» ў дамы ваду. Мы паглядзелі, што можна зрабіць. У выніку ў вёсцы знайшлося ўжо чалавек 20, хто б хацеў правесці сабе ваду. Ім мы дапамаглі.

Быў выпадак, калі людзі звярнуліся з просьбай зрабіць дадатковы аўтобусны прыпынак у дачным пасёлку.

— Працягласць гэтага пасёлка была большая за кіламетр. Уявіце сабе: людзі едуць з дачы з цяжкімі сумкамі. Як правіла, пенсіянеры. І трэба 700-800 метраў прайсці пехатою. Кіраўніцтва аўтобуснага парка пайшло насустрач. У выніку ў гэтым дачным таварыстве аўтобус працягнуў свой адрэзак руху метраў, можа, на 700.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

АДКРЫТЫ ФОРУМ

ЁСЦЬ ШТО ЎСПОМНІЦЬ!

Адыходзячы год пры ўсім жаданні не назавеш простым. (Ці бываюць яны ўвогуле — простыя?) Тым не менш кожная «дыстанцыя» даўжынёй у 365 дзён — гэта не толькі суцэльная барацьба за хлеб надзённы і выпрацоўка імунітэту да ўдараў лёсу... Гэта яшчэ і пэўныя ўдачы, дасягненні, перамогі — вялікія і маленькія, маштабныя і лакальныя, калектыўныя і асабістыя, значныя і практычна незаўважныя для шырокага кола грамадзян... Якім быў адыходзячы год для нашых дэпутатаў? Што ў ім здарылася такога адметнага? Чым ён запомніўся? Слова — народным абраннікам.

Нэла ШУНЬКІНА, старшыня Быхаўскага раённага Савета дэпутатаў:

— Шмат чаго было зроблена па навядзенні парадку на зямлі, займаемся добраўпарадкаваннем маленькіх населеных пунктаў. Аграгарадок Абідавічы да раённых «Дажынак» падрыхтавалі так, што было не пазнаць. Адрамантавалі дарогі, зрабілі бягучы рамонт школы і сельскага дома культуры, у парку абсталявалі дзіцячую пляцоўку. Дарожнікі прыгожа аформілі павільён на прыпынку грамадскага транспарту, намалявалі поле са спелымі каласамі. Цяпер, калі сюды прыязджаеш, вока радуецца... Зараз узяліся за Смоліцу — у наступным годзе будзем тут святкаваць раённыя «Дажынкі». Працуем у цеснай сувязі са старшынёй райвыканкама Сяргеем Ігнаценкам. Ён шмат увагі надае таму, каб наш раён выглядаў прывабна.

Ірына МАРЦІНОВІЧ, старшыня Смілавіцкага сельскага Савета дэпутатаў:

— Сіроты пры жывых бацьках — так кажуць пра дзяцей, чые маці або таты пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Як правіла, гэта людзі, што захапляюцца спіртным, за бутэльку з наклейкай гатовы адмовіцца ад самага дарагога ў жыцці — сыноў і дачушак. І калі ўдаецца вырваць з бездані п'янства хоць аднаго чалавека, лічы, што год прайшоў нездарма.

Сёлета мы не дапусцілі, каб непаўналетніх забралі з сем'яў. Адна жанчына выхоўвае траіх дзетак без мужа. Другая сям'я — поўная. Звязвала іх адно няшчасце: моцна выпівалі маці. Угаварылі іх прайсці агляд у нарколага, псіхіятра, уладкавацца на працу, навесці парадак у доме. Для гэтага кожнай адвялі па 2-3 тыдні. Яны выканалі ўсе нашы ўмовы, закадзіраваліся і нават у пацвярджэнне прынеслі неабходныя даведкі. Вось так мы выратавалі сем'і, у якіх выхоўваюцца па трое непаўналетніх дзяцей, ад распаду, а малых — ад сацыяльнага прытулку. Так што можна і трэба ўздзейнічаць на маці, накіроўваць іх на правільны шлях.

Сяргей АШМЯНЦАЎ, старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў:

— З самых яркіх, добрых уражанняў адыходзячага года я назваў бы адкрыццё школы ў Высокім 1 верасня. Гэта было сапраўды свята ўсяго горада. Адзіную ў пяцітысячным гарадку школу давялося закрыць на рэканструкцыю, а дзяцей размеркаваць па іншых установах. Зразумела, што пэўныя нязручнасці цярпелі вучні, бацькі, настаўнікі. І вось, па сутнасці, новая, добра аснашчаная, прыгожая, добраўпарадкаваная школа сустрэла сваіх гаспадароў.

Адкрыццё школы ў Высокім Брэсцкай вобласці.

Бацькі цяперашніх вучняў падыходзілі і дзякавалі за такі падарунак да Дня ведаў, казалі, што нават крыху зайздросцяць сваім дзецям, якія будуць вучыцца тут. Большасць цяперашніх бацькоў таксама заканчвалі гэту школу — тады яна, праўда, нашмат больш сціплы мела выгляд... Цяпер установа адукацыі стала ўпрыгажэннем невялікага горада. Архітэктура будынка такая, што асобныя корпусы яго ўтвараюць круглы ўнутраны дворык. Цяпер у ім паставілі ёлку. Спадзяюся, што навагоднае свята, як і наступны год, будзе для вучняў з Высокага радасным і шчаслівым.

Вячаслаў ГРЫБАНАЎ, старшыня Акцябрскага сельскага Савета дэпутатаў Віцебскага раёна:

— Спрацавалі сёлета з добрымі вынікамі. Даходная частка бюджэту выканана, як і расходная. Усё, што планавалі, зрабілі, і нават больш. У Шапурах добраўпарадкавалі найбуйнейшы мемарыял, дзе ўвекавечана памяць тысяч вызваліцеляў і ахвяр вайны. І ў аграгарадку Копці прывялі ў парадак воінскі мемарыял імя Ленінскага камсамола. Дарэчы, у 2016 годзе энтузіяст па яго стварэнні, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Віктар Дзямьянавіч Цярэшчанка, адсвяткуе 90-годдзе. З ім мы пастаянна на сувязі. Ужо думаем над тым, што падарыць нашаму паважанаму земляку...

Ну а яшчэ — змагаліся з баршчэўнікам, працавалі, каб вакол дарожнага палатна было чыста і прыгожа. Галоўнае, на месцы не сядзелі.

Галіна БЯЛЯЕВА, дэпутат Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў:

— Гэты год быў багаты на падзеі. Дэпутацкая праца — даволі руцінны занятак. Нехта звяртаецца, каб памяняць батарэю, нехта просіць пасадзейнічаць у добраўпарадкаванні дваровай тэрыторыі... Мне было прыемна дапамагаць дзіцячаму садку №34 у набыцці гульнявай пляцоўцы. Там ёсць усё для дзіцячай радасці: горка, арэлі. Калі бачу, як дзятва на іх гушкаецца, радуюся, што маю да гэтага непасрэднае дачыненне.

Запомнілася, як ездзілі да віцебскіх калег знаёміцца з вопытам іх працы. Цікава было даведацца, якія ў іх падыходы. Цяпер чакаем іх да сябе ў госці... Асобная размова — нашы спартакіяды. Для мяне, як навічка ў дэпутацкай справе, было нечаканасцю, што народны абраннік павінен мець яшчэ і добрую фізічную форму. Чаго толькі не прыходзілася рабіць дзеля агульнага каманднага выніку — і канат цягнуць, і ў мяшку скакаць, і бегаць, і плаваць, і нават страляць...

Алена АЛЕКСІНА, старшыня Буда-Кашалёўскага раённага Савета дэпутатаў:

— Сёлета ўсе дэпутаты нашага раёна прынялі актыўны ўдзел у добраўпарадкаванні месцаў пахавання ахвяр Вялікай Айчыннай вайны да юбілею Перамогі. Гэта было зроблена на сродкі, зароблены на раённым суботніку. Дарэчы, на тэрыторыі раёна пахавана больш за 800 мірных жыхароў, якія загінулі ў пакутах... Сярод школьнікаў у год 70-годдзя Перамогі правялі акцыю «Семдзесят «дзясятак» — Вялікай Перамозе», якую ініцыявалі дэпутаты райсавета. Узнагародай для малодшых пераможцаў стала наведванне цырка і палаца Румянцавых-Паскевічаў у Гомелі. А вось падлеткаў чатырох старшых класаў мы павезлі ў Мінск, дзе яны пабывалі ў Палаце прадстаўнікоў і Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Дарэчы, здзейсніць такую паездку нам дапамаглі ў тым ліку дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Пётр Шостак і член Савета Рэспублікі Аляксандр Ляхаў.

Увесь наш раён падключыўся да ўдзелу ў праекце «Гісторыя маёй сям'і», які амаль на тры месяцы захапіў вясковых жыхароў. Дэпутаты дапамаглі знайсці тых сужэнцаў, якія могуць стаць для іншых сапраўдным прыкладам шчаслівага сямейнага жыцця. Многія жыхары раёна падчас гэтага праекта зазірнулі ў сямейныя архівы і альбомы, пачалі збіраць звесткі аб продках, зацікавіліся сваім радаводам...

Мы ганарымся і тым, што ў вёсцы Чабатовічы адкрылі цэнтр народнага побыту, які дазваляе ўявіць, як тут жылі людзі на пачатку мінулага стагоддзя. Адноўлены склеп, адрына, альтанка, студня, а непасрэдна ў хаце — старадаўнія рэчы, калекцыі адзення, упрыгожанняў, тканых вырабаў, якія шмат гадоў збіралі супрацоўнікі мясцовага дома культуры. На экскурсіі сюды прыязджаюць цяпер не толькі школьнікі з усяго раёна, але і замежныя госці.

18 000 долараў — на адраджэнне плошчы

Журавіцкі сельвыканкам Рагачоўскага раёна перамог у конкурсе мясцовых ініцыятыў у рамках праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які рэалізуецца Праграмай развіцця ПРААН і фінансуецца ЕС. На аднаўленне ў аграгарадку гістарычнай плошчы выдаткавана $18 000.

Цяпер у Журавічах, дзе пражываюць 345 сем'яў, няма, як калісці, спецыялізаванай плошчы для гандлю. Між тым пра яе мараць і індывідуальныя прадпрымальнікі, і жыхары, бо аграгарадок знаходзіцца за 60 км ад райцэнтра. Насельніцтва разам з мясцовымі ўладамі зацікавілена ў рэалізацыі ініцыятывы «Адраджэнне рыначнай плошчы». Увасабленне ў жыццё гэтай ідэі палепшыць якасць гандлю і паслужыць штуршком да з'яўлення яе новых формаў.

Дарэчы, у гэтым конкурсе таксама перамаглі ініцыятывы Рагачоўскага лясгаса і раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, якія атрымаюць аналагічную фінансавую дапамогу для рэалізацыі сваіх праектаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

НА КАГО СПАДЗЯВАЦЦА ПЕНСІЯНЕРУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— А канкурэнтаў у вас шмат? Напрыклад, прыватнікі, сельскагаспадарчыя арганізацыі?

— У калгасаў хапае сваёй работы: і пасяўная, і касавіца, і жніво. У прыватніка нашмат даражэйшыя паслугі. Мы ж працуем у цесным кантакце з сельскімі Саветамі. Хто ж лепш за работнікаў сельвыканкамаў ведае сваіх жыхароў? — канстатуе Таццяна Міхайлаўна. — Разам кантралюем і пытанні падрыхтоўкі да зімовага перыяду: гэта рамонт пячэй, электраправодкі, усталяванне аўтаматычных пажарных апавяшчальнікаў. Працуем і па выяўленчым прынцыпе, паколькі ёсць асобныя грамадзяне, якія не пускаюць нікога на парог. Напрыклад, суседзі расказалі, што ў аднаго з жыхароў, да якога не маглі дастукацца спецыялісты, печка амаль што развалілася: да бяды недалёка. У такіх выпадках мы рыхтуем пісьмо ў раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях з просьбай дапамагчы. Спецыялісты вызначаюць ступень разбурэння, даюць заключэнне. І мы далей працуем з чалавекам. У нас распрацавана адпаведная праграма, пад якую прадугледжаны сродкі. У гэтым годзе адрамантавалі печкі двум ветэранам Вялікай Айчыннай вайны.

> Калі грамадзянін моцна п'е, яму нельга даверыць грошы на канкрэтную мэту, напрыклад набыццё дроў. Прывозім іх самі.

Калі ў грамадзяніна ёсць дзеці, то работнікі цэнтра дасылаюць ім пісьмы. Калі яны працаздольнага ўзросту, не на пенсіі, іх просяць звярнуць увагу на бацькоў, дапамагчы ліквідаваць непаладкі, недахопы. Адзінокім дапамагаюць сабраць дакументы на атрыманне дзяржаўнай адраснай дапамогі. Але ж у гэтым выпадку чалавек можа патраціць яе не па прызначэнні.

— Калі грамадзянін моцна п'е, яму нельга даверыць грошы на канкрэтную мэту, напрыклад набыццё дроў. Прывозім іх самі, сваім транспартам, ужо гатовыя, пасечаныя, дапамагаем складваць. Такім жа чынам дзейнічаем і ў дачыненні да шматдзетных, малазабяспечаных сем'яў, да тых сем'яў, дзе дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Нашы работнікі ідуць з мамамі і дзецьмі ў краму і набываюць неабходныя прадукты і тавары на вылучаныя грошы.

Ну, а што тычыцца непасрэдна састарэлых грамадзян, то ў наступным годзе ў Крупках адкрыецца аддзяленне кругласутачнага знаходжання на 30 месцаў і сумеснага сезоннага пражывання на 9 месцаў. На адной тэрыторыі будуць два сацыяльныя аб'екты, што эканамічна выгадна з пункту гледжання дастаўкі прадуктаў і расходу паліва.

lazovskaya@zviazda.by

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«...ІДУ ДА ІХ САМА...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Пасля вайны трэба было падымаць народную гаспадарку, карміць сям'ю. Дзеці вайны, якім тады было па 13-14 гадоў, замест коней упрагаліся ў плуг. Лета Марына разам з аднакласнікамі праводзіла на жніве і нават была брыгадзіркай. Пад яе кіраўніцтвам працавалі 12 малалетніх жней. Каб паспець за дарослымі, яны прыходзілі на сваю дзялянку за некалькі гадзін да іх. І не сыходзілі, пакуль не даводзілі справу да канца.

Па месцы жыхарства

З 1951 года яна на працягу 9 скліканняў была дэпутатам гарсавета, у тым ліку старшынёй камісіі па народнай адукацыі. Апошнія тры скліканні Марына Кравец — дэпутат Быхаўскага раённага Савета. Яе выбарчая акруга — цэнтральная частка Быхава, дзе жывуць у большасці пенсіянеры.

— Паколькі гэта людзі пераважна старога ўзросту, імкнуся праводзіць прыём па месцы жыхарства, — кажа яна. — Пішам аб'явы, паведамляем, калі, у які час, адбудзецца сустрэча. Звычайна гэта выхадны дзень, другая яго палова. Каб у чалавека быў час зрабіць свае справы, схадзіць у краму, навесці дома парадак.

Пры сустрэчах вырашаюцца розныя пытанні. Напрыклад, у інтэрнатах жылкамгаса і ПМК №247 не было гарачай вады. Цяпер праблема вырашана. Займаемся абсталяваннем дзіцячых пляцовак, добраўпарадкаваннем дваровых тэрыторый, зносам аварыйных дрэў, нават пытаннямі выхавання дзяцей. Ствараем умовы для занятасці дзяцей у выхадны дзень пры інтэрнаце. Праз дамы дзіцячай творчасці арганізоўваюцца гурткі, дзе можна займацца маляваннем, лепкай, іншымі карыснымі справамі. Ёсць дзеці, якія патрабуюць кантролю, але яны пад наглядам і дырэктара школы, і каменданта інтэрната.

> Кантраляваць выкананне зваротаў трэба абавязкова. У мяне ёсць вялікі нататнік, дзе захоўваюцца запісы за апошнія 10 гадоў. Гэта вельмі зручна.

Усе, хто звярнуўся да Марыны Кравец, могуць нават не сумнявацца — вынік будзе. Бо больш адказнага чалавека цяжка знайсці. Першай справай яна даносіць народныя пытанні да старшыні раённага Савета дэпутатаў Нэлы Шунькінай, і ўжо разам яны шукаюць шляхі вырашэння справы.

— Бывае, што прыходзіцца рабіць запыты паўторна, — кажа Марына Андрэеўна. — Напрыклад, у доме №48 прарвала трубу, і там доўга не маглі давесці справу да канца. Нарэшце ўсё было зроблена, я прайшла і асабіста ва ўсім пераканалася. Кантраляваць выкананне зваротаў трэба абавязкова. У мяне ёсць вялікі нататнік, дзе захоўваюцца запісы за апошнія 10 гадоў. Гэта вельмі зручна, бо два разы на год я раблю справаздачу перад сваімі выбаршчыкамі. У мяне ўсё пазначана, якія былі звароты і што па іх зроблена.

Разам са старшынёй Быхаўскага райсавета Нэлай ШУНЬКІНАЙ.

«Дайце — і ўсё!»

— Апошнім часам скаргаў і зваротаў паменела, — канстатуе Марына Кравец. — Але ёсць людзі, якія некалькі разоў прыходзяць па адным і тым жа пытанні. Звярнуўся неяк адзін грамадзянін — хацеў інвалідную каляску. Але ён не меў групы інваліднасці. Якая тут можа быць каляска? Мужчына ж патрабаваў: дайце — і ўсё!.. У такіх выпадках трэба мець цярпенне, каб дастукацца да чалавека, растлумачыць, чаму нельга. Інакш ён падумае, што ад яго проста адвярнуліся і не жадаюць чуць.

На думку дэпутата, шмат чаго страчана, калі распаўся Савецкі Саюз, у плане выхавання моладзі. Сёння ветэраны ідуць у школы, расказваюць падлеткам пра такія паняцці, як мужнасць, веліч, стойкасць і гераізм.

— Мы назапасілі вялікі матэрыял пра тых людзей, якія вызвалялі Быхаў, — Марыя Андрэеўна дэманструе флэшку. — Тут запісаны ўспаміны тых, хто перажыў ліхалецце. Шукаем новыя формы, метады і сродкі патрыятычнага выхавання моладзі. Праводзім сустрэчы ў школах, ахоплены ўсе дзеці з 3 па 11 клас. Меншым расказваем пра подзвігі хлопчыкаў-партызанаў, старэйшым — пра партызанскі рух у Беларусі.

З раніцы — гімнастыка

Нельга не звярнуць увагі на тое, што Марына Андрэеўна выглядае не па гадах маладжава. Цікаўлюся, у чым сакрэт.

— Ніякага сакрэту няма, — усміхаецца яна, і яе твар яшчэ больш прыгажэе. — Адзін раз у жыцці аблілася халоднай вадой і захварэла. З таго часу больш не эксперыментую. А палове восьмай я ўжо выходжу на працу — у раённы савет ветэранаў. І так кожны дзень, ніякіх прагулаў. Шмат спаць нельга. У 11 вечара — адбой, а ў 6 раніцы — пад'ём. І штодзённа ранішняя гімнастыка. Як педагог, я ведаю, што такое фізкультура. У юнацтве была спартсменкай, займала прызавыя месцы. Але галоўнае — гэта ўсё ж такі праца.

Каб усюды паспяваць, нельга расслабляцца і наракаць на свой лёс, лічыць Марына Андрэеўна Кравец. Ордэн Пашаны, уручаны Прэзідэнтам Беларусі, стаў для яе самай вялікай адзнакай за ўсё тое, што яна рабіла і робіць. «Я падзякавала Прэзідэнту за мудрае кіраўніцтва дзяржавай, за клопат аб ветэранах. І так было кранальна, калі ён узяў мае рукі ў свае далоні, шчыра ўсміхнуўся і сказаў «дзякуй»...

zigulya@zviazda.by

Фота аўтара.

ТАКІЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ НАМ НЕ ПАТРЭБНЫ

Пра дэфіцыт маладых кадраў на вёсцы сёння не гаворыць толькі лянівы. А вось у Магілёўскім раёне адбыўся выпадак з дакладнасцю наадварот.

Двое выпускнікоў аднаго з магілёўскіх прафтэхвучылішч з пасведчаннямі трактарыста-машыніста, а таксама машыніста экскаватара і бульдозера, якія прыйшлі працаўладковацца ў сельгаспрадпрыемства «Махава», былі прынятыя па спецыяльнасці, але выконвалі не звязаныя з ёй абавязкі.

У выніку і заробкі атрымалі меншыя, чым ім належала. Не задаволеныя сваім лёсам, яны звярнуліся ў КДК Магілёўскай вобласці з прэтэнзіяй, што іх прафесійныя навыкі не запатрабаваны. Падчас разгляду гэтай сітуацыі інфармацыя пацвердзілася.

— Маладыя спецыялісты сапраўды працавалі не па спецыяльнасці ў той час, як дзяржава на іх адукацыю выдаткавала 170 мільёнаў рублёў, — паведаміў **начальнік управлення Камітэта дзяржкантролю Магілёўскай вобласці Алег СТРЫГУН.** — Адказныя асобы сельгаспрадпрыемства патлумачылі, што хлопцы дрэнна валодалі сваёй прафесіяй і ім нельга было давяраць тэхніку. На жаль, правесці пераатэстацыю, каб упэўніцца, што маладыя людзі не кампетэнтныя, не было магчымасці, — зараз яны праходзяць тэрміновую службу ў арміі. Мы накіравалі пісьмо ў Магілёўскі аблвыканкам, дзе звярнулі ўвагу на гэты факт. Нам паабяцалі, што кантроль за станам падрыхтоўкі маладых спецыялістаў у сістэме ўстаноў прафтэхадукацыі вобласці будзе ўзмоцнены.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

...І чалавечыя кантакты

Пытанні эканамічнага супрацоўніцтва, рэалізацыі сумесных трансгранічных праектаў і іншых рэгіянальных ініцыятыў абмеркавалі ў Гродне ўдзельнікі сустрэчы гарадоў-пабрацімаў і партнёраў Беларусі і Польшчы.

Уладзімір ДЗЯШКО, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама:

— Гэты год быў у такім кірунку даволі паспяховым. Рэалізавана шмат сумесных праектаў трансгранічнага супрацоўніцтва ў сферах аховы здароўя, адукацыі, спорту, культуры, турызму і іншых. Гродна і 14 раёнаў вобласці заключылі пагадненні і дагаворы аб супрацоўніцтве з 20 гмінамі, акругамі, паветамі і гарадскімі радамі Польшчы.

Сёлета адбылася чарговая выстава еўрарэгіёна «Нёман», і, як заўсёды, у ёй удзельнічалі і прадпрыемствы з польскім капіталам, якія працуюць у Беларусі. Па аб'ёме таваразвароту Польшча на Гродзеншчыне трывала займае другое месца пасля Расіі. Мы імкнёмся стварыць польскім, як і любым замежным інвестарам, добрыя ўмовы гаспадарання. Зараз у вобласці дзейнічаюць 75 арганізацый з польскім капіталам.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ЯК ГЭТА БУДЗЕ?

ЗАМЕСТ СМЕЦЦЕПРАВОДАЎ — НОВЫЯ КАНТЭЙНЕРЫ

А мінчан заахвоцяць дыферэнцаванымі тарыфамі

Налета ў сталічных шматпавярховіках плануюць заварыць каля тысячы «ствалоў» смецціправодаў. Добра гэта ці дрэнна? Гарадскія ўлады лічаць, што такім чынам з'явіцца стымул для асобнага збору смецця мінчанамі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Мінску цяпер перапрацоўваецца не менш як 30% сабраных насельніцтвам другасных рэсурсаў. Яшчэ год таму гэтая лічба складала прыкладна 17%. Як праінфармавала **намеснік генеральнага дырэктара «Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі» Галіна ГІЛЕВІЧ,** у сталіцы для асобнага збору цвёрдых бытавых адходаў (паперы, шкла, пластыку) добраўпарадкавана 31 новая пляцоўка і рэканструяваны 52.

— Для правядзення адзінай тэхнічнай палітыкі прынята рашэнне на ўзроўні Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі пра выкарыстанне ацынкаваных кантэйнераў, — адзначыла намеснік гендырэктара прадпрыемства.

Кожны год у сталіцы ўсталёўваецца каля 1,5 тысячы новых кантэйнераў для асобнага збору смецця. З 2013 года на гарадскіх вуліцах сталі з'яўляцца еўракантэйнеры для другаснай сыравіны. Яны ў 1,5 раза большыя па аб'ёме, чым стандартныя, што дазваляе скараціць колькасць гэтых ёмістасцяў у дварах. Акрамя таго, з іх дапамогай забяспечваецца больш якасны збор другаснай сыравіны, бо за кошт закрытай канструкцыі туды нельга выкінуць пакет са смеццем. У першую чаргу такія кантэйнеры размяшчаюцца ў цэнтральнай частцы горада, уздоўж каркасных вуліц і далей — у дварах. Усяго для сталіцы іх неабходна каля 15 тысяч. Налета па краіне плануюць устанавіць амаль 4 тысячы кантэйнераў для асобнага збору ДМР, з іх каля 1,3 тысячы — у сталіцы.

Тым часам сёлета ў Мінску было запланавана заварыць «ствалы» 452 смецціправодаў у 113 жылых дамах.

— Паводле заканадаўства, каб заварыць смецціправод, трэба атрымаць згоду жыхароў. За гэты год праведзена 328 сходаў, атрымана згода жыхароў 104 дамоў. Фактычна работа па закрыцці праведзена. Да канца бягучага года трэба выканаць заданне, закрыць пакінутыя смецціправоды, — сказаў **першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ.**

Ён адзначыў, што да канца года Мінгарвыканкам сумесна з Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі плануе ўнесці прапановы па мерах стымулявання насельніцтва, напрыклад, па ўвядзенні дыферэнцаваных тарыфаў.

Аднак **старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ** раскрытыкаваў адказныя службы горада за павольныя тэмпы гэтай працы. Паводле яго слоў, з жыхарамі варта больш актыўна праводзіць тлумачальную работу.

Неабходна сказаць насельніцтву, колькі каштуе дэзынсекцыя і дэратызацыя, колькі каштуе прыборка смецціправодаў. Вы павінны былі сказаць: мы заварваем смецціправоды, але пасля гэтага вы атрымаеце паасобны тарыф і мы робім вам дзіцячую пляцоўку ці іншыя даброты. Каб насельніцтва зразумела: за тое, што яно пазбаўляецца нейкага элемента камфорту, атрымлівае чысты пад'езд, эканамічны стымул і нешта ў дварыў, — сказаў старшыня Мінгарвыканкама і паабяцаў узяць гэтую тэму на асабісты кантроль.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

seradzyuk@zviazda.by

УРОКІ ЖЫЦЦЯ

УСЕ СРОДКІ ДОБРЫЯ, ХОЦЬ І НЕ ЎСЕ ДЗЕЙСНЫЯ

Наш карэспандэнт пабываў у памежным з Расіяй раёне Беларусі і пацікавіўся, як змагаюцца з тымі, хто вырабляе ці прывозіць нелегальны алкаголь.

«Вязуць не найлепшае»

Статыстыка ўражвае: сёлета ў Лёзненскім раёне канфіскавалі больш за 5,6 тысячы літраў самагонкі і брагі. Гэта ж колькі басейнаў імі запоўніць можна?

— Пераважна гоняць самагон — калі ў вялікай колькасці — у непрыдатных для пражывання і кінутых дамах. І вельмі цяжка вызначыць уладальнікаў падпольнай вытворчасці. Але мы гэта робім. У выяўленні самагоншчыкаў актыўна дапамагаюць старэйшыны і старшыні сельскіх Саветаў, — распавядае **начальнік аддзялення аховы правапарадку і прафілактыкі Лёзненскага РАУС Аляксандр РЫБАКОЎ.**

Асаблівасць Лёзненскага раёна ў тым, што ён мяжуе з Расійскай Федэрацыяй. А мяжа, як вядома, празрыстая. Гэтым і карыстаюцца кантрабандысты.

— З Расіі да нас алкаголь вязуць у вялікай колькасці. Сёлета затрымалі больш за 2,2 тысячы літраў. Перавозчыкі, зразумела, імкнуцца абхітрыць. Мужчына вёз 18 скрынь гарэлкі. Патлумачыў, што на гадавіну па смерці жонкі. А яшчэ адзін, каб схаваць 600 літраў спіртнога, грунтоўна пераабсталяваў мікрааўтобус. Між іншым, кантрабандысты прывозяць пераважна «левае» спіртное. Напрыклад, бутэлька гарэлкі «Белая бяроза», «Царскае паляванне» на рынку ў Смаленску каштуе 70 рублёў. Якія вывады? Не на заводзе зроблена. Пры гэтым у бутэльках ёсць нават пластыкавыя дазатары. Ад сапраўднай гарэлкі гэтую можна адрозніць толькі па фальшывай акцызнай марцы, — адзначыў **Канстанцін КНЯЗЕЎ, начальнік Лёзненскага РАУС**. — І тое зелле потым прадаюць нам. Таму, хто рэалізуе, зразумела, выгадна: нават калі 100% нацэнку зробіш на бутэльку, купяць, бо ў краме яна даражэйшая. А як левы алкаголь паўплывае на арганізм, пра гэта пакупнікі наўрад ці задумваюцца.

Суразмоўца, дарэчы, вельмі спяшаўся на пасяджэнне савета прафілактыкі, дзе традыцыйна спрабуюць перавыхоўваць выпівох і гультаёў. Прапанаваў паўдзельнічаць.

«Калегі па цэху»

Колькі ўжо пісаў пра, скажам так, праблемных людзей, але не перастаю здзіўляцца гісторыям іх «падзення». Чарговыя пачуў у Лёзненскім сельвыканкаме.

Чарговы «кліент», дакладней, «кліентка», спачатку ніяк не прызнавалася, што піла. Потым прагаварылася: была на памінках.

— Чаму дроў няма? Ну, будуць на днях. Ведаю, што снежань ужо. Часу не было нарыхтаваць, я ж цяпер працую. Не забірайце дачку ў прытулак... Да нарколага сёння не магу. Напэўна, заўтра, — адказвала на пытанні грамадзянка. Раней яна працавала на мясцовым ільнозаводзе, ды выгналі... Цяпер у памежным расійскім раёне «знайшла сябе» на кансервавай вытворчасці.

— Я б цяпер быў ваенным пенсіянерам і добрую пенсію атрымліваў бы, але СССР разваліўся, я і стаў цывільным... Не магу працу нармальную знайсці. Не гультай я, падпрацоўваю. Падаткі чаму не плачу? Ад дзяржавы мне нічога не трэба, па медыцынскую дапамогу не звяртаюся, — разважаў 51-гадовы мужчына.

Яго «калега па цэху» таксама ўразіў.

— Пашпарт чаму не атрымліваю? А ён мне не патрэбны!!! Ну і што з таго, што тры гады без пашпарта? Мне да гэтага ніякай справы няма! У мяне вунь рукі хворыя і чатыры пальцы непрацуючыя. Працаваў у холадзе, калі транспарцёры рамантаваў. Чаму ў бальніцу не іду? А вам якая справа? — рэзка адказваў на пытанні мужчына.

Патрэбна матывацыя

— Сёлета на аналагічныя пасяджэнні савета прафілактыкі выклікалі каля 70 чалавек. Па выніках разгляду былі прыняты рашэнні. У прыватнасці, прайшлі кансультацыі ў нарколага 11 грамадзян, у ЛПП адправілі траіх. Дапамагаем і працу знайсці, і цэглу купіць, і печ адрамантаваць. Усё магчымае робім, каб чалавек вярнуўся да нармальнага жыцця, — дзеліцца вопытам **старшыня Лёзненскага сельвыканкама Святлана ПУКАВА.**

— Сёння гэтым людзям спрабавалі дапамагчы не толькі прадстаўнікі праваахоўных органаў, а і службы занятасці, сістэмы адукацыі. Цесна супрацоўнічаем і з прадстаўнікамі духавенства, грамадскімі арганізацыямі. У прыватнасці, «Чырвоны Крыж» аказвае дапамогу тым, хто вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі... Вядома, чалавеку патрэбна матывацыя. І каб да яго «дастукацца», усе сродкі добрыя, — лічыць **намеснік старшыні Лёзненскага райвыканкама Ірына ДЗЕРВАЕД.**

Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.

Лёзненскі раён — Віцебск.

pukshanski@zviazda.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.035. Нумар падпісаны ў 19.30 22 снежня 2015 года.

РАСКЛАД РУХУ

з 13 снежня 2015 года

ЦЯГНІКОЎ ГАРАДСКІХ ЛІНІЙ І ЦЯГНІКОЎ РЭГІЯНАЛЬНЫХ ЛІНІЙ ЭКАНОМКЛАСА

▶ Участак Мінск—Маладзечна

Адпраўленне са станцыі МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

Станцыя прызначэння	Час адпраўлення са ст. Мінск-Пасажырскі	Час прыбыцця на канцавую станцыю	Дні курсіравання	Прыпынкі
Маладзечна	0-30	2-10	штодзень	б/п Татаршчызна, Селівонаўка
Маладзечна	4-39	6-10	штодзень	б/п Мінскае Мора, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі
Беларусь	5-00	5-34	штодзень	усюды
Маладзечна	5-20	7-03	штодзень	усюды
Беларусь	5-45	6-19	штодзень	усюды
Беларусь	6-00	6-34	штодзень	усюды
Гудагай	6-10	9-11	штодзень	да ст. Маладзечна з прыпынкамі па п.п.Мінск-Паўночны, ст. Ждановічы, да ст. Смаргонь — з усімі прыпынкамі, далей з прыпынкамі па ст. Солы, Ашмяны
Маладзечна	6-23	8-15	штодзень	усюды
Беларусь	6-40	7-14	штодзень	усюды
Маладзечна	7-20	9-11	штодзень	усюды
Беларусь	7-32	8-06	штодзень	усюды
Беларусь	8-20	8-54	штодзень	усюды
Беларусь	8-43	9-17	штодзень	усюды
Маладзечна	8-57	10-43	штодзень	усюды
Беларусь	9-22	9-56	штодзень	усюды
Маладзечна	9-52	11-38	штодзень	усюды
Беларусь	10-32	11-06	штодзень	усюды
Беларусь	11-23	11-57	штодзень	усюды
Маладзечна	11-33	13-17	штодзень	усюды
Ждановічы	12-10	12-26	з панядзелка па чацвер	усюды
Беларусь	12-10	12-45	з пятніцы па нядзелю	усюды
Ждановічы	12-35	12-51	з панядзелка па чацвер	усюды
Беларусь	12-35	13-10	з пятніцы па нядзелю	усюды
Маладзечна	12-48	14-35	штодзень	усюды
Беларусь	13-35	14-09	штодзень	усюды
Маладзечна	14-40	16-25	штодзень	б/п Селівонаўка
Беларусь	14-55	15-30	штодзень	усюды
Ждановічы	15-10	15-26	штодзень	усюды
Маладзечна	15-36	17-23	штодзень	усюды
Беларусь	16-00	16-34	штодзень	усюды
Маладзечна	16-19	18-11	штодзень	усюды
Беларусь	16-35	17-09	штодзень	усюды
Беларусь	17-25	17-59	штодзень	усюды
Маладзечна	17-35	19-19	штодзень	усюды
Беларусь	17-47	18-21	штодзень	усюды
Гудагай	18-05	20-48	штодзень	да ст. Маладзечна – з прыпынкамі па п.п. Мінск-Паўночны, ст. Ждановічы, ад станцыі Маладзечна з прыпынкамі па ст. Пруды, Залессе, Солы, Ашмяны, Смаргонь і п.п. Маладзёжны
Маладзечна	18-15	20-07	штодзень	усюды
Беларусь	18-35	19-09	штодзень	усюды
Маладзечна	19-14	21-06	штодзень	усюды
Беларусь	19-30	20-04	штодзень	усюды
Беларусь	20-18	20-52	штодзень	усюды
Маладзечна	20-45	22-31	штодзень	усюды
Маладзечна	22-16	00-03	штодзень	б/п Мясата, Татаршчызна, Крыніца, Селівонаўка

– цягнік гарадскіх ліній

Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

Станцыя адпраўлення	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця на ст. Мінск-Пасажырскі	Дні курсіравання	Прыпынкі
Маладзечна	4-14	5-59	штодзень	б/п Селівонаўка
Беларусь	5-47	6-21	штодзень	усюды
Маладзечна	5-11	6-58	штодзень	усюды
Беларусь	6-35	7-09	штодзень	усюды
Аляхновічы	6-10	7-18	з панядзелка па пятніцу	усюды
Маладзечна	5-42	7-29	штодзень	усюды
Беларусь	7-17	7-51	штодзень	усюды
Беларусь	7-34	8-08	штодзень	усюды
Маладзечна	6-45	8-42	штодзень	усюды
Беларусь	8-17	8-51	штодзень	усюды
Маладзечна	7-33	9-21	штодзень	усюды
Беларусь	9-05	9-39	штодзень	усюды
Беларусь	9-35	10-09	штодзень	усюды
Маладзечна	8-59	10-47	штодзень	усюды
Гудагай	8-20	10-59	штодзень	з прыпынкамі па ст. Ашмяны, Солы, Смаргонь, Залессе, Пруды, Маладзечна, Ждановічы, п.п. Маладзёжны, Мінск-Паўночны
Беларусь	10-35	11-09	штодзень	усюды
Маладзечна	9-58	11-53	штодзень	усюды
Беларусь	11-55	12-29	штодзень	усюды
Маладзечна	11-12	12-59	штодзень	усюды
Беларусь	12-45	13-19	штодзень	усюды
Ждановічы	13-34	13-50	з панядзелка па чацвер	усюды
Беларусь	13-15	13-50	з пятніцы па нядзелю	усюды
Ждановічы	14-04	14-20	з панядзелка па чацвер	усюды
Беларусь	13-45	14-20	з пятніцы па нядзелю	усюды
Маладзечна	13-02	14-49	штодзень	усюды
Беларусь	14-45	15-19	штодзень	усюды
Ждановічы	15-34	15-50	штодзень	усюды
Маладзечна	14-57	16-44	штодзень	усюды
Беларусь	16-30	17-05	штодзень	усюды
Маладзечна	15-45	17-33	штодзень	усюды
Беларусь	17-22	17-56	штодзень	усюды
Беларусь	17-40	18-14	штодзень	усюды
Маладзечна	16-45	18-33	штодзень	усюды
Беларусь	18-32	19-06	штодзень	усюды
Беларусь	18-52	19-26	штодзень	усюды
Маладзечна	18-01	19-50	штодзень	усюды
Беларусь	20-02	20-36	штодзень	усюды
Маладзечна	19-09	20-55	штодзень	усюды
Беларусь	20-35	21-09	штодзень	усюды
Маладзечна	19-42	21-30	штодзень	усюды
Беларусь	21-30	22-04	штодзень	усюды
Маладзечна	20-53	22-35	штодзень	усюды
Гудагай	20-14	22-54	штодзень	з прыпынкамі па ст. Ашмяны, Солы, Смаргонь, Залессе, Пруды, Маладзечна, Ждановічы і п.п. Маладзёжны, Мінск-Паўночны
Маладзечна	22-17	23-55	штодзень	б/п Раманы, Пралескі, Хмелеўка, Зялёнае, Крыжоўка

– цягнік гарадскіх ліній

▶ Участак Мінск—Асіповічы

Адпраўленне са станцыі МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

Станцыя прызначэння	Час адпраўлення са ст. Мінск-Пасажырскі	Час прыбыцця на канцавую станцыю	Дні курсіравання	Прыпынкі
Пухавічы	0-44	1-58	штодзень	б/п Вяндзеж, Тэхнікум
Асіповічы	5-11	7-12	штодзень	б/п Чыгуначны
Рудзенск	5-23	6-11	штодзень	усюды
Рудзенск	5-50	6-38	штодзень	усюды
Асіповічы	6-19	8-18	штодзень	б/п Чыгуначны, Вярхі
Асіповічы	6-44	8-57	штодзень	усюды
Рудзенск	7-24	8-12	штодзень	усюды
Талька	7-52	9-31	штодзень	усюды
Рудзенск	8-14	9-02	штодзень	усюды
Асіповічы	8-27	10-31	штодзень	усюды
Рудзенск	12-42	13-30	штодзень	усюды
Талька	13-26	15-16	штодзень	усюды
Рудзенск	14-00	14-48	штодзень	усюды
Асіповічы	14-17	16-20	штодзень	усюды
Талька	16-04	17-44	штодзень	усюды
Рудзенск	16-28	17-16	штодзень	усюды
Рудзенск	17-25	18-13	штодзень	усюды
Асіповічы	17-40	20-08	штодзень	усюды
Асіповічы	18-28	20-39	штодзень	б/п Вярхі
Асіповічы	18-57	21-21	штодзень	усюды
Пухавічы	20-00	21-26	штодзень	усюды
Рудзенск	20-37	21-25	штодзень	усюды
Асіповічы	20-45	22-48	штодзень	б/п Вярхі
Асіповічы	22-49	0-47	штодзень	б/п Вяндзеж, Вяленскі, Весялоўскі, Вярхі

– цягнік гарадскіх ліній

Адпраўленне з п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

Станцыя прызначэння	Адпраўленне з п.п. Інстытут Культуры	Час прыбыцця на канцавую станцыю	Дні курсіравання	Прыпынкі
Асіповічы	9-13	11-30	штодзень	усюды
Асіповічы	12-10	14-14	штодзень	усюды
Асіповічы	15-20	17-43	штодзень	усюды

Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

Станцыя адпраўлення	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця на ст.Мінск-Пасажырскі	Дні курсіравання	Прыпынкі
Пухавічы	4-56	6-13	штодзень	усюды
Пухавічы	5-40	6-57	штодзень	усюды
Рудзенск	6-22	7-10	штодзень	усюды
Асіповічы	5-20	7-22	штодзень	б/п Вярхі
Пухавічы	6-18	7-35	з панядзелка па пятніцу	усюды
Рудзенск	6-54	7-42	штодзень	усюды
Асіповічы	5-57	8-02	штодзень	усюды
Рудзенск	7-23	8-26	з панядзелка па пятніцу	усюды
Рудзенск	8-21	9-09	штодзень	усюды
Асіповічы	7-47	9-48	штодзень	б/п Чыгуначны
Рудзенск	9-27	10-15	штодзень	усюды
Асіповічы	11-14	13-16	штодзень	б/п Вярхі
Рудзенск	14-07	14-55	штодзень	усюды
Асіповічы	13-35	15-48	штодзень	усюды
Рудзенск	15-28	16-16	штодзень	усюды
Талька	15-43	17-35	штодзень	усюды
Рудзенск	17-39	18-27	штодзень	усюды
Асіповічы	16-37	18-41	штодзень	б/п Вярхі
Асіповічы	17-14	19-41	штодзень	усюды
Рудзенск	19-11	19-59	штодзень	усюды
Талька	18-42	20-21	штодзень	усюды
Асіповічы	18-41	20-44	штодзень	усюды
Асіповічы	20-09	22-23	штодзень	б/п Вярхі, Вяндзеж, Новае Сяло, Чыгуначны
Пухавічы	21-42	23-00	штодзень	усюды
Асіповічы	22-15	0-29	з панядзелка па суботу	усюды
Асіповічы	22-50	0-29	па нядзелях	б/п Вярхі, Весялоўскі, Майскі, Блужа, Вяленскі, Тэхнікум, Вяндзеж, Дрычын, Новае Сяло, Раўнаполле, Рыбцы, Зазерка, Седча, Асееўка, Мачулішчы, Чыгуначны

– цягнік гарадскіх ліній

Прыбыццё на п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

Станцыя адпраўлення	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця на п.п. Інстытут Культуры	Дні курсіравання	Прыпынкі
Асіповічы	8-46	10-50	штодзень	б/п Вярхі, Блужа, Вяленскі, Новае Сяло, Раўнаполле, Чыгуначны
Талька	10-55	12-37	штодзень	усюды
Асіповічы	14-38	16-44	штодзень	усюды

▶ Участак Мінск—Баранавічы

Адпраўленне са станцыі МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

Станцыя прызначэння	Час адпраўлення са ст. Мінск-Пасажырскі	Час прыбыцця на канцавую станцыю	Дні курсіравання	Прыпынкі
Баранавічы	0-46	3-28	штодзень	б/п Сталічны, Рошча, Пціч, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Адцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды, Сінява, Асіпаўшчына, Вароцішча, Ліпа, Хвоева, Пагарэльцы, Юшкевічы, Крошын, Альсевічы, Пост 1
Баранавічы	4-29	6-58	штодзень	б/п Сталічны, Пціч, Воўчкавічы, Пяцігор'е, Станькава, Дзяржынск, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Адцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды
Стоўбцы	5-38	7-35	штодзень	б/п Сталічны
Баранавічы	7-56	10-49	штодзень	б/п Сінява, Асіпаўшчына, Вароцішча, Ліпа, Альсевічы
Стоўбцы	17-47	19-32	штодзень	усюды
Баранавічы	20-44	23-19	штодзень	б/п Сінява, Асіпаўшчына, Ліпа, Юшкевічы, Альсевічы
Стоўбцы	21-26	23-05	штодзень	б/п Сталічны
Стоўбцы	22-35	0-24	штодзень	б/п Сталічны

Адпраўленне з п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

Станцыя прызначэння	Час адпраўлення з п.п. Інстытут Культуры	Час прыбыцця на канцавую станцыю	Дні курсіравання	Прыпынкі
Баранавічы	7-12	9-54	штодзень	усюды
Стоўбцы	9-14	10-55	штодзень	усюды
Баранавічы	9-49	12-29	штодзень	усюды
Баранавічы	11-39	14-50	штодзень	усюды
Стоўбцы	12-52	14-27	з пятніцы па нядзелю	усюды
Баранавічы	13-51	16-35	штодзень	усюды
Стоўбцы	14-41	16-17	з паня-дзелка па пятніцу	усюды
Гарадзея	14-41	16-56	па суботах, нядзелях	б/п Сінява, Асіпаўшчына, Вароцішча
Стоўбцы	15-23	17-08	штодзень	усюды
Баранавічы	16-06	18-58	штодзень	б/п Мезінаўка, Кучкуны
Баранавічы	17-14	20-25	штодзень	усюды
Баранавічы	18-40	21-27	штодзень	усюды
Стоўбцы	19-26	21-01	штодзень	усюды

Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

Станцыя адпраўлення	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця на ст. Мінск-Пасажырскі	Дні курсіравання	Прыпынкі
Стоўбцы	4-12	5-50	штодзень	усюды
Стоўбцы	5-35	7-13	штодзень	усюды
Стоўбцы	8-03	9-52	штодзень	Цёмныя Ляды, Мезінаўка, Асіна
Баранавічы	14-20	17-18	штодзень	усюды
Стоўбцы	17-29	19-19	з панядзелка па пятніцу	усюды
Гарадзея	17-13	19-19	па суботах, нядзелях	б/п Вароцішча, Асіпаўшчына, Сінява
Баранавічы	17-33	20-19	штодзень	усюды
Стоўбцы	20-26	22-26	штодзень	усюды
Баранавічы	22-10	0-27	штодзень	з прыпынкамі па станцыях (акрамя ст. Пагарэльцы) і п.п. Рошча, Курасоўшчына, Сталічны

Прыбыццё на п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

Станцыя адпраўлення	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця на п.п. Інстытут Культуры	Дні курсіравання	Прыпынкі
Стоўбцы	5-10	6-45	штодзень	усюды
Баранавічы	4-47	7-37	штодзень	б/п Пост 1, Юшкевічы, Ліпа, Кучкуны, Адцэда
Стоўбцы	6-29	8-35	з паня-дзелка па пятніцу	усюды
Баранавічы	6-28	8-58	штодзень	б/п Альсевічы, Крошын, Юшкевічы, Ліпа, Вароцішча, Асіпаўшчына, Сінява, Цёмныя Ляды, Кучкуны, Адцэда, Мезінаўка, Асіна, Клыпаўшчына, Станькава, Пяцігор'е, Бярэжа, Воўчкавічы, Пціч
Баранавічы	7-31	10-20	штодзень	б/п Кучкуны, Адцэда, Клыпаўшчына, Станькава, Пяцігор'е, Бярэжа, Воўчкавічы, Пціч
Баранавічы	8-20	11-19	штодзень	усюды
Стоўбцы	11-23	12-59	з пятніцы па нядзелю	усюды
Баранавічы	11-40	14-15	штодзень	б/п Хвоева, Ліпа, Вароцішча, Асіпаўшчына, Сінява, Сталічны
Баранавічы	12-49	15-44	штодзень	усюды
Стоўбцы	16-13	18-04	штодзень	усюды
Баранавічы	16-09	18-48	штодзень	б/п Ліпа, Асіпаўшчына, Сінява, Кучкуны, Адцэда, Мезінаўка, Асіна
Стоўбцы	19-14	21-00	штодзень	усюды
Баранавічы	20-37	23-06	штодзень	б/п Цёмныя Ляды, Кучкуны, Адцэда, Мезінаўка, Асіна, Бярэжа

▶ Участак Мінск—Орша

Адпраўленне са станцыі МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

Станцыя прызначэння	Час адпраўлення са ст. Мінск-Пасажырскі	Час прыбыцця на канцавую станцыю	Дні курсіравання	Прыпынкі
Барысаў	0-34	2-10	штодзень	б/п Дамашаны, Барсукі, Пралетарская Перамога
Орша	4-47	8-33	штодзень	б/п Слабада, Дамашаны, Загор'е, Пралетарская Перамога, Галашоўка, Дзятлава, Ламачына
Смалявічы	7-27	8-08	штодзень	б/п Садовы, Слабада, Дамашаны, Загор'е
Смалявічы	9-50	10-31	штодзень	б/п Садовы, Слабада, Дамашаны, Загор'е
Смалявічы	13-10	13-51	па пятніцах, суботах, нядзелях	б/п Садовы, Слабада, Дамашаны, Загор'е
Барысаў	17-04	18-48	штодзень	усюды
Смалявічы	18-18	18-59	штодзень	б/п Садовы, Слабада, Дамашаны, Загор'е
Барысаў	21-26	22-33	штодзень	з прыпынкамі Мінск-Усходні, Смалявічы, Зарэчнае, Жодзіна-Паўднёвае, Печынскі

– цягнік гарадскіх ліній

Адпраўленне з п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

Станцыя прызначэння	Час адпраўлення з п.п. Інстытут Культуры	Час прыбыцця на канцавую станцыю	Дні курсіравання	Прыпынкі
Орша	6-38	10-58	штодзень	усюды
Барысаў	7-37	9-31	штодзень	усюды
Орша	14-30	18-55	штодзень	усюды
Барысаў	17-36	19-23	штодзень	усюды
Орша	18-50	22-36	штодзень	б/п Выдзершчына, Перавалачны, Галашоўка, Дзятлава, Ламачына
Барысаў	19-30	21-09	штодзень	усюды
Барысаў	20-32	22-09	штодзень	усюды

Адпраўленне са станцыі МІНСК-УСХОДНІ

Станцыя прызначэння	Час адпраўлення са ст. Мінск-Усходні	Час прыбыцця на канцавую станцыю	Дні курсіравання	Прыпынкі
Крупкі	5-40	7-46	штодзень	усюды
Барысаў	8-50	10-18	штодзень	усюды
Орша	10-31	14-24	штодзень	усюды
Орша	12-42	16-35	штодзень	усюды
Орша	16-00	19-57	штодзень	усюды
Барысаў	22-37	0-04	штодзень	усюды

Адпраўленне са станцыі БАРЫСАЎ

Станцыя прызначэння	Час адпраўлення са ст. Барысаў	Час прыбыцця на канцавую станцыю	Дні курсіравання	Прыпынкі
Орша	4-38	6-55	штодзень	усюды

Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

Станцыя адпраўлення	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця на ст. Мінск-Пасажырскі	Дні курсіравання	Прыпынкі
Смалявічы	6-19	7-00	штодзень	б/п Садовы, Слабада, Дамашаны, Загор'е
Барысаў	6-30	7-39	штодзень	з прыпынкамі Печынскі, Жодзіна-Паўднёвае, Зарэчнае, Трактарны, Мінск-Усходні
Смалявічы	8-17	8-58	штодзень	б/п Садовы, Слабада, Дамашаны, Загор'е
Смалявічы	10-55	11-36	штодзень	б/п Садовы, Слабада, Дамашаны, Загор'е
Смалявічы	14-10	14-51	па пятніцах, суботах, нядзелях	б/п Садовы, Слабада, Дамашаны, Загор'е
Орша	12-33	16-41	штодзень	усюды
Смалявічы	19-25	20-06	штодзень	б/п Садовы, Слабада, Дамашаны, Загор'е
Орша	20-16	23-58	штодзень	б/п Пралетарская Перамога, Барсукі, Дамашаны, Слабада, Садовы

– цягнік гарадскіх ліній

Прыбыццё на п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

Пачатковая станцыя	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця на п.п. Інстытут Культуры	Дні курсіравання	Прыпынкі
Барысаў	4-26	6-02	штодзень	усюды
Барысаў	5-04	6-56	штодзень	усюды
Барысаў	6-36	8-16	штодзень	усюды
Орша	4-30	8-52	штодзень	усюды
Крупкі	8-46	11-03	штодзень	усюды
Орша	8-55	13-04	штодзень	усюды
Орша	13-57	18-00	штодзень	усюды
Барысаў	16-56	18-33	штодзень	усюды
Орша	15-36	19-27	штодзень	усюды
Барысаў	19-05	20-51	штодзень	усюды
Барысаў	20-29	22-08	штодзень	усюды

Прыбыццё на станцыю МІНСК-УСХОДНІ

Станцыя адпраўлення	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця на ст. Мінск-Усходні	Дні курсіравання	Прыпынкі
Барысаў	5-41	7-14	штодзень	усюды
Орша	5-57	10-09	штодзень	усюды
Барысаў	12-50	14-20	штодзень	усюды
Орша	17-28	21-26	штодзень	б/п Траціпава, Пралетарская Перамога, Барсукі, Загор'е

■ Пераадоленне

НА ХЭНДБАЙКУ — ДА БАЛТЫЙСКАГА МОРА

Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з 27-гадовым лідчанінам Аляксандрам АЎДЗЕВІЧАМ, які нядаўна пераадолеў на хэндбайку (па сутнасці, гэта веласіпед з педалямі, якія круцяць рукамі) больш за паўтысячы кіламетраў! Цяпер ён марыць аб новых падарожжах, а як кіраўнік міжраённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Рэспубліканская асацыяцыя інвалідаў-калясачнікаў» імкнецца разам з мясцовымі ўладамі зрабіць Ліду горадам, дзе камфортна людзям з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

Фота Алы БІБІКАВАЙ.

Пачынаць з сябе!

— Пасля жудаснай аварыі я трапіў у сітуацыю, з якой трэба было выбірацца. Яшчэ ўчора ты — малады хлопец, ходзіш, працуеш, «тусуешся». І раптам не можаш павярнуцца, адчуваеш уласную бездапаможнасць. Спачатку былі нават думкі пра самазабойства. Але потым, калі я стаў крыху прыходзіць у сябе, зразумеў: каб стала лепш, трэба нешта мяняць. І пачынаць найперш з сябе.

У мяне, пэўна, плюс у тым, што жыву ў невялікім горадзе, дзе дастукацца да мясцовай улады нашмат лягчэй, чым у мегаполісе. Калі прыязджаеш на інваліднай калясцы ў той жа выканкам, то на цябе глядзяць зацікаўлена. І прэса звяртае ўвагу: вось хлопец, які нешта хоча зрабіць. Ужо камусьці цікава абараняць твае інтарэсы нават таму, што гэта нешта «новенькае».

— Як ацэньваеце стан безбар'ернага асяроддзя ў сваім горадзе?

— У Лідзе шмат зроблена ў гэтым кірунку. Цэнтр практычна ўвесь прыстасаваны, каб перасоўвацца на інваліднай калясцы. Хоць ёсць і шмат недахопаў. І наша грамадская арганізацыя з'яўляецца невялікім органам маніторынгу, які кажа: «Хлопцы, перарабіце, нам тут нязручна». «Як? Што? Гэта ж прыгожа». Але ты гаворыш на поўным сур'ёзе: «Ведаеце, класна выглядае, але я не магу ў краму заехаць».

Такія арганізацыі, лічу, вельмі неабходны. Хаця б для таго, каб у патрэбны момант нагадаць звычайнаму будаўніку, які сам не ездзіць на калясцы, пэўныя правілы і нормы безбар'ернага асяроддзя, параіць, як лепш зрабіць.

Мой знаёмы, дырэктар аўташколы, прыехаў да мяне і спытаў: што табе патрэбна, каб вадзіць машыну? Потым ён паехаў у сталіцу, даведаўся, як наладзіць у аўташколе навучанне інвалідаў-калясачнікаў.

— Што яшчэ, на ваш погляд, важна зрабіць у Лідзе для інвалідаў-калясачнікаў?

— Самым дзейсным крокам магло б стаць стварэнне залы актыўнай рэабілітацыі. Бо ўсе людзі, якія трапілі ў такую сітуацыю дарослымі альбо знаходзяцца ў ёй з дзяцінства, маюць патрэбу ў спецыяльных фізічных практыкаваннях. Гэта важна і з пункту гледжання псіхалагічнай рэабілітацыі.

Бачыце, у мяне палова пакоя занята трэнажорамі, яшчэ ў гаражы ёсць некалькі. І я з задавальненнем аддаў бы іх у гэтую залу актыўнай рэабілітацыі, каб займаліся і іншыя.

ДАРЭЧЫ

Лідская арганізацыя інвалідаў-калясачнікаў мае патрэбу ў спецыяльным інвентары для залы рэабілітацыі людзей з парушэннем апорна-рухальнага апарату (плюс для правядзення заняткаў у басейне). Хто жадае аказаць садзейнічанне ў яго набыцці, звяртайцеся па тэл. 8-029 550-92-07.

Не ахвяраванняў чакаць, а працаваць

— Хтосьці, пэўна, думае, што калясачнікам патрэбны толькі ахвяраванні. І раптам — сацыяльны праект «Працаўладкаванне. Курс на збліжэнне»...

— Мы сабралі нашых лідчан з інваліднасцю ў цэнтральнай бібліятэцы, запрасілі прадстаўнікоў цэнтра занятасці, людзей, якія, нягледзячы на абмежаваныя фізічныя магчымасці, дабіліся поспеху ў бізнесе. Паказалі тым самым, што працаўладкаванне інвалідаў-калясачнікаў цалкам рэальнае. Расказалі пра адпаведныя варыянты, ільготы, якія пры гэтым атрымлівае працадаўца. Потым знялі ў розных рэгіёнах Беларусі 5 відэаролікаў — на прыкладзе канкрэтных людзей з інваліднасцю: як яны працуюць? З якімі праблемамі сутыкнуліся? Гэтых людзей запрасілі на сустрэчу з членамі нашай грамадскай арганізацыі.

— Тое, што інваліднасць — гэта не прысуд, а выпрабаванне, якое трэба з годнасцю вытрымліваць, даказвае, напрыклад, ваш зямляк Андрэй Гурын...

У ТЭМУ

Андрэй МІМІШ, начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Лідскага райвыканкама:

— Нядаўна на пасяджэнні райвыканкама разглядалі праблемы, што тычацца інвалідаў-калясачнікаў. За апошнія некалькі гадоў на многіх гарадскіх аб'ектах праводзіліся работы па іх абсталяванні элементамі безбар'ернага асяроддзя. У прыватнасці, устанавілі ў жылых дамах 34 пандусы для ўезду на інваліднай калясцы. Вырабілі на «Лідсельмашы» і ўстанавілі ў дамах для інвалідаў-калясачнікаў 5 пад'ёмных прыстасаванняў і яшчэ 2 — у раённым цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі. Акрамя таго, спецыяльным пад'ёмнікам аснашчаны басейн спартыўна-аздараўленчага комплексу «Алімпія».

Кіраўнікам мясцовых прадпрыемстваў даручылі вывучыць магчымасці стварэння новых рабочых месцаў для працаўладкавання інвалідаў-калясачнікаў. Паставілі задачу абнавіць банк даных будынкаў, дзе неабходна забяспечыць патрабаванні безбар'ернага асяроддзя. Па прапанове Аляксандра Аўдзевіча, які падарожнічаў да Балтыйскага мора, для інвалідаў-калясачнікаў будзе абсталявана дарожка да вады на гарадскім пляжы. Акрамя таго, даручана закупіць і ўстанавіць у горадзе біятуалеты для інвалідаў.

— А ці ажыццявіцца мара Аляксандра Аўдзевіча аб стварэнні ў Лідзе цэнтра рэабілітацыі для інвалідаў-калясачнікаў?

— Гэтую ідэю таксама абмяркоўвалі. Яна рэальная і будзе ажыццяўляцца.

— Ён малайчына! І ў бізнесе сябе знайшоў, і ў спартзалу ходзіць, бывае на розных гарадскіх імпрэзах. Я — малады хлопец, а ён — з іншага пакалення, але ў нас інтарэсы практычна аднолькавыя.

— Як асабіста вам удаецца зарабляць?

— Па спецыяльнасці я інжынер-праграміст. Пасля аварыі працаваў год вэб-дызайнерам у фірме. А потым стаў займацца праектнай дзейнасцю, зразумеўшы, што магу зарабляць грошы за кошт таго, што нешта паляпшаецца. Скажам, у кірунку безбар'ернага асяроддзя, альбо лабіруючы тыя ж пытанні з працаўладкаваннем інвалідаў. Існуе, аказваецца, нямала фондаў, якія могуць падтрымаць матэрыяльна. Безумоўна, для гэтага трэба шмат энтузіязму, энергіі. Напрыклад, павінен ведаць, як зняць відэаролік. Я ў гэтым знайшоў нейкую сваю «нішу». Здымаю відэаролікі на тэму інваліднасці: як трэніруецца, займацца сабой. Дасць Бог, неўзабаве стартуе ўжо трэці праект.

— Ці ёсць вынік ад вышэйпамянёнага праекта па працаўладкаванні?

— На сёння два чалавекі працаўладкоўваюцца. Адзін — на прадпрыемства зноў жа інваліда-калясачніка з Мінска, дзе вырабляюць ручное кіраванне на машыны. Будзе працаваць на камп'ютары. А другая жанчына будзе займацца кансультаваннем кліентаў адной сталічнай фірмы па тэлефоне — сядзець дома і адказваць на пытанні.

— Ведаю, што лідская аўташкола «ДрайвМайстар» навучае інвалідаў-калясачнікаў ваджэнню аўтамабіля...

— Гэтым можа займацца любая аўташкола. Калі яе кіраўніку цікава навучаць людзей з інваліднасцю, якія не могуць карыстацца педалямі, а толькі рукамі, то гэта даволі проста. Патрэбна толькі машына з аўтаматычнай каробкай перадач і ручным кіраваннем. Як атрымалася ў Лідзе? Мой знаёмы, дырэктар аўташколы, прыехаў да мяне і спытаў: што табе патрэбна, каб вадзіць машыну? Потым ён паехаў у сталіцу, даведаўся, як наладзіць у аўташколе навучанне інвалідаў-калясачнікаў. У яго была машына на «аўтамаце» — пераабсталяваў яе на ручное кіраванне. І цяпер кожны, хто можа сабе дазволіць купіць такі аўтамабіль, можа навучыцца ў Лідзе ваджэнню.

Як «калясачнік» дапамог балерыне

Нядаўна ў лідскім Палацы культуры адбылася прэм'ера спектакля па матывах п'есы Ігара Шпрыца «Дзяўчына і кентаўр». Аляксандр Аўдзевіч сыграў там адну з галоўных роляў:

— Маладая балерына «ламаецца», трапляе ў бальніцу і спрабуе скончыць жыццё самагубствам. І я, «калясачнік», бачу гэта і пачынаю з яе кпіць, угаворваю не вешацца. Прыязджае прафесар з Амерыкі, які робіць эксперыментальныя аперацыі са ствалавымі клеткамі, і я саступаю ёй сваю чаргу. Ёй робяць аперацыю, яна становіцца на ногі. Другое дзеянне: ужо я ў роспачы, а яна прыязджае з Амерыкі і мяне супакойвае. Вось такі спектакль.

— Колькі ў Лідзе інвалідаў-калясачнікаў?

— Зараз у нашай арганізацыі каля 30 чалавек, але рэальна іх больш. Многіх вельмі складана ўцягваць у соцыум, нечым зацікаўліваць. Замыкаюцца ў сваіх сценах...

— Дык што, прыклады таго ж Андрэя Гурына і ваш — гэта выключэнні?

— Лічу, што тут справа нейкай «моды». Гэта значыць, трэба зрабіць модным, што інвалід-калясачнік прысутнічае на дыскатэцы, фестывалі, іншых імпрэзах. Прычым зрабіць гэта прыгожа, так, што каля яго, як каля дарагой машыны, тусуецца моладзь. І думае: як жа класна дапамагаць такому чалавеку! І не проста дапамагаць, а быць разам з ім.

Вось што мне хочацца памяняць у свядомасці грамадства. Бо калі я «зламаўся» і паглядзеў нейкія мерапрыемствы інвалідаў, то мне яны здаліся нецікавымі. Ды лепш наогул нічога не рабіць, чым так. Але разам з тым паглядзеў і некалькі цікавых фільмаў, дзе інваліднасць паказана з іншага боку. Так, «калясачнік», але ж які цікавы! Не так ужо ўсё і дрэнна ў гэтага чалавека. І мне хацелася б дзейнічаць у такім ключы і знаходзіць адпаведнае разуменне ў грамадстве. А не проста чуць: «Давайце ім дапамагаць».

— Што параіце людзям, якіх тая ці іншая жыццёвая сітуацыя абмежавала ў фізічных магчымасцях?

— Найперш — сацыялізавацца ў грамадстве. І знайсці тое, чым ім цікава займацца. Калі б я, дапусцім, быў пісьменнікам, то купіў бы зручнае крэсла, пісаў і быў шчаслівы. Але, як правіла, большасць людзей нават не пісьменнікі, не камп'ютаршчыкі, менеджары і бухгалтары, якія могуць прымяніць свае веды, а рабочыя ці, напрыклад, прадаўцы. І, атрымаўшы інваліднасць, многія ў роспачы: дык хто ж я цяпер? Але ўсё ж трэба рабіць усё магчымае, каб знайсці для сябе «нішу» — гэта галоўнае.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

г. Ліда.

На хэндбайку (з архіва Аляксандра Аўдзевіча).

КАБ ЁЛКА НЕ АЗМРОЧЫЛА СВЯТА

ВЫБІРАЕМ «ЗЯЛЁНУЮ ГОСЦЮ»

Калі вы хочаце набыць для святкавання Новага года «зялёную госцю» з лесу, то трэба зважаць на тое, ці ёсць у хаце маленькія дзеці ці хатнія жывёлы, якія могуць незнарок паваліць яе. Будзьце гатовы да таго, што з інтэрвалам у некалькі гадзін давядзецца прыбіраць вакол дрэва: елкі маюць уласцівасць скідваць хвою. Яна можа ўспыхнуць як запалка ад любой выпадковай іскры ці проста ад награвальнага прыбора. Менавіта таму ратаўнікі не рэкамендуюць трымаць ёлку ў хаце працяглы час. Як толькі дрэва пачало інтэнсіўна асыпацца, лепш вынесці яго з дома. Калі ж вы вырашылі абмежавацца штучнай прыгажуняй, то бярыце толькі тыя вырабы, якія прапіталі адмысловымі проціпажарнымі рэагентамі. Інфармацыю пра гэта можна знайсці на ўпакоўцы.

Якіх бы памераў і паходжання ні была елка, самае галоўнае — каб яна трывала стаяла. У грамадстве вялікую папулярнасць мае традыцыйнае вядро з вільготным пяском ці апілкамі. Такая няхітрая канструкцыя дазваляе перыядычна паліваць дрэва.

Але ратаўнікі раяць спыніцца на спецыяльных крыжавінах ці падстаўках, якія прадаюцца ў многіх гаспадарчых крамах. Выбар іх вельмі шырокі — пад любыя дыяметр ствала і вышыню. Прадаюцца і спецыяльныя падстаўкі з рэзервуарамі для вады. Для большай бяспекі пажадана паставіць ёлку ў тым пакоі, дзе вы бываеце найчасцей, каб звесці да мінімуму магчымасць знаходжання дзіцяці аднаго ля святочнага дрэва. Дываны і розныя пакрыцці падобнага кшталту лепш прыбраць. А ў ідэале трэба ставіць ёлку як мага далей ад тэлевізара, батарэй ацяплення і абагравальнікаў.

САКРЭТЫ ЭЛЕКТРЫЧНЫХ ГІРЛЯНД

Ёлка без ілюмінацыі выглядае неяк не па-святочнаму. Таму яе ўпрыгажэннем даўно сталі самыя разнастайныя электрычныя гірлянды. Не трэба гнацца за вельмі таннымі электрагірляндамі кітайскага паходжання. Невядома, дзе і як іх збіралі. Сэканомленыя пару дзясяткаў тысяч рублёў могуць

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

пасля адгукнуцца кароткім замыканнем і пажарам. Таму лепш крыху дабавіць грошай, але купіць нармальны тавар заводскай вытворчасці. Тое ж датычыцца і прыбораў, тэрмін эксплуатацыі якіх даўно скончыўся, але якія шмат у каго і дагэтуль ляжаць «у загашніку». Яны адрозніваюцца істотнай даўгавечнасцю і да таго ж вельмі ўстойлівыя да вільгаці. І, вядома ж, не пакідайце малых дзяцей сам-насам з уключанай электрагірляндай, яе іскрацілівыя агеньчыкі будуць вабіць іх з узмоцненай сілай.

Перад тым, як уключыць гірлянду, не будзе лішнім праверыць на трываласць ізаляцыю правадоў і месцы іх злучэння. Справа ў тым, што хваёвыя дрэвы гараць вельмі хутка. Пажарныя неяк правялі цікавы эксперымент: яны засякалі на таймеры, колькі часу трэба агню, каб знішчыць ёлку. Вынікі нярадасныя: штучным дастаткова 15 секунд, для натуральнага дрэва паказчык таксама не нашмат большы — прыкладна каля 40 секунд. Вільготнае дрэва гарыць даўжэй. Яшчэ адзін фактар, на які абавязкова трэба звярнуць увагу падчас выбару гірлянды, — гэта яе магутнасць. Кожны такі прыбор стварае нагрузку на электрычную сетку, здольнасці якой усё ж абмежаваныя. Таму не варта перабольшваць з колькасцю гірлянд. Калі падключыць больш за тры зіхатлівыя расцяжкі, сетка рызыкуе не вытрымаць. І ўвогуле, чым меншая магутнасць лямпачак, тым і награвацца яны будуць слабей. Таму лепш спыніцца на святлодыёдных вырабах. А вось вату, паперу і іншыя гаручыя матэрыялы ад ёлкі з электрагірляндамі лепш прыбраць як мага далей.

А што рабіць, калі ёлка, крый Божа, загарэлася? Першае — гэта абясточыць электрагірлянду. І тут жа абрынуць дрэва на падлогу. Для тушэння можна выкарыстаць падручныя сродкі — вогнетушыцель, пакрывала, коўдру з натуральных матэрыялаў. А вось штучную ёлку патушыць значна складаней. Вадой — нельга: могуць разляцецца іскры і падпаліць рэчы навокал. Калі агонь за 10-15 секунд не згас, застаецца толькі адно: тэрмінова пакінуць памяшканне, каб не надыхацца атрутнымі выпарэннямі, і выклікаць ратаўнікоў.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. *schklennik@zviazda.by*

■ Гэта мы, Госпадзі...

«ПРЫСТРАШЫЛІ»...

У Мінску за 5 мільёнаў учынена двайное забойства. Супрацоўнікі сталічнай міліцыі вызначылі і затрымалі асоб, якія падазраюцца ў здзяйсненні забойства двух маладых людзей у Маскоўскім раёне Мінска.

Ранкам у нядзелю ў кватэры па вуліцы Алібегава былі знойдзены трупы мужчыны і жанчыны са шматлікімі нажавымі раненнямі шыі і тулава. Па целе мужчыны было нанесена каля 50 удараў, жанчыны — больш за 30. Аператыўнікі высветлілі, што да здзяйснення злачынства могуць быць датычныя два маладыя чалавекі, якіх, як мяркуецца, наняла за 5 мільёнаў рублёў колішняя блізкая сяброўка маладога чалавека.

Паводле інфармацыі Маскоўскага РУУС г. Мінска, асноўны мяркуемы матыў злачынства — помста былой каханай колішняга хлопца. Але забіваць саперніцу яна не прасіла, а хацела толькі адправіць у бальніцу «тыдні на два», каб бесперашкодна аднавіць адносіны з маладым чалавекам. Выканаўцы «перастараліся» і забілі абаіх. Заведзена крымінальная справа.

А неўзабаве ад Следчага камітэта паступіла новая інфармацыя. Па-першае, былі ўстаноўлены асобы загінулых. Дзяўчыне было 24 гады, мужчыну — 32. Па-другое, колькасць падазраваных павялічылася з трох да чатырох чалавек. Сярод іх — 26-гадовая дзяўчына і мужчыны 1972, 1984 і 1992 гадоў нараджэння. Следства ўстанаўлівае ўсе абставіны і матывы забойства, а таксама ролю кожнага з затрыманых у яго здзяйсненні.

НАЖОМ НА ЗАЎВАГУ ПРА ПАРКОЎКУ

Цягам сутак супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Партызанскага РУУС сталіцы затрымалі 26-гадовага мінчаніна, які нанёс цяжкія цялесныя пашкоджанні мужчыну ў адказ на заўвагу пра няправільную паркоўку аўтамабіля.

— Інцыдэнт адбыўся на вуліцы Румянцава. Малады чалавек прыпаркаваўся пад забараняльным знакам, сам застаўся ў машыне. Да яе падышоў 30-гадовы мужчына, які быў нападпітку, і папрасіў закурыць, — расказала прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Наталля Ганусевіч. — Атрымаўшы запальнічку, стаў абражаць маладога чалавека, выказваючы сваю незадаволенасць прыпаркаваным аўтамабілем. Потым пачаў біць па машыне рукамі, паспрабаваў ударыць праз адкрытае акно кіроўцу. Апошні, застаючыся ў салоне, дастаў нож і нанёс крыўдзіцелю пранікальныя колата-рэзаныя раны. Пасля чаго знік з месца здарэння. Вызначыць асобу зламысніка дапамагла жанчына, якая была сведкай канфлікту і запомніла аўтамабільныя нумары. Заведзена крымінальная справа, маладому чалавеку пагражае пазбаўленне волі на тэрмін да васьмі гадоў. Дарэчы, раней затрыманы не быў судзімы.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Градус праблемы

КАЛІ КРЫЎДЗЯЦЬ САМЫЯ БЛІЗКІЯ

Карэспандэнты «Звязды» наведалі разам з міліцыяй праблемныя сем'і

«Ды я проста хварэю, ныркі слабыя, — скардзіцца жанчына, разпораз войкаючы і хапаючыся за бакі. — Яшчэ і артрыт. А лячуся півам. Таму мінулым разам і была быццам выпіўшы, вы ж не падумайце...» Рэпліка адрасавана міліцыянерам — старшаму ўчастковаму інспектару Савецкага РУУС сталіцы маёру міліцыі Віктару СЯНЬКЕВІЧУ і ўчастковаму інспектару лейтэнанту Ганне ЧУМАКОВАЙ, якія праводзяць аперацыю «Быт». Падчас яе міліцыя наведваецца «ў госці» да тых асоб, якія здзяйснялі правапарушэнні ў сферы сямейна-бытавых зносін, — з мэтай прафілактыкі. У прыватнасці, згаданая вышэй жанчына канфліктуе з сынам, звычайна на глебе алкаголю.

Паэма пра цяжкі жаночы лёс і мужа-алкаголіка нарэшце знайшла сваіх слухачоў.

— Часцей за ўсё пад нашу ўвагу трапляюць людзі, якія проста не могуць ужыцца адно з адным, — тлумачыць Віктар Сянькевіч, пакуль мы крочым на чарговы адрас. — У такіх сітуацыях нярэдка даходзіць да боек, сямейнага гвалту, як фізічнага, так і маральнага. Дзейныя асобы — далёка не заўсёды сужэнцы. Гэта могуць быць проста блізкія родзічы: зяці з цешчамі, свякрові з нявесткамі, бацькі з дзецьмі...

Пры гэтым рэцыдывы здарэнняў, пасля якіх сямейныя дэбашыры панеслі адміністрацыйную адказнасць, па словах участковага міліцыянера, здараюцца нячаста. І гэта ў многім — вынік працы міліцыі. «Ёсць сем'і, якія мы ведаем дасканала, — тлумачыць Віктар Сянькевіч, — сочым за імі, увесь час трымаем сітуацыю на кантролі. Але ёсць тыя, хто ніколі не трапляў пад увагу міліцыі, а потым «выстраліў» пасля «бяседы» за кілішкам якога-небудзь моцнага напою».

Участковыя плануюць маршрут паводле спіса, у якім указана каля дзесяці адрасоў. Менавіта столькі кватэр ім трэба наведаць за гэты вечар. Усе дамы знаходзяцца побач з універсамам «Рыга» — раён забудоўваўся ў асноўным у 1970-я, таму жыхары тут пераважна сталага веку. Адсюль — згаданыя вышэй праблемы бацькоў і дзяцей.

У гаспадара памёр сябар па мянушцы Кінг-Конг. З тых часоў пенсіянеру, відаць, няма з кім абмеркаваць цяжкі лёс, вось ён і чапляецца да родных на п'яную галаву.

Па прыклад далёка хадзіць не трэба, чарговы пункт прызначэння — кватэра пенсіянеркі Тамары. Жанчына, былы вязень канцлагера, не можа паразумецца з маладым пакаленнем. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягвалі ўсіх дарослых жыхароў кватэры: саму Тамару, яе дачку і зяця. Апошні мінулым разам быў змешчаны ў лячэбна-працоўны прафілакторый. Пры гэтым, па словах участковага, ініцыятыва ў канфліктах нярэдка належыць якраз пенсіянеркі: яе хвалюе, што зяць не дае грошай на аплату кватэры менавіта ёй. «Дыялог звычайнымі метадамі наладзіць ім не ўдаецца, — кажа Віктар Сянькевіч, — размаўляць нармальна пачынаюць толькі тады, калі справа даходзіць да прыцягнення да адказнасці».

Падчас гэтага візіту ўсё, здаецца, нармальна. Тамары дома няма. Дачка гаспадыні кватэры кажа, што канфліктаў апошнім часам удаецца пазбягаць.Таму прычыны для ўмяшання праваахоўнікаў няма. «Цікава: як толькі бабуля сыходзіць, усё становіцца ідэальна, — канстатуе ўчастковы. — Таму корань праблемы адразу відаць».

Дарэчы, усіх сваіх «кліентаў» Віктар Сянькевіч ведае асабіста. Некаторыя літаральна выраслі на вачах участковага. За столькі гадоў працы паспеў пазнаёміцца з усімі, таму размова звычайна пачынаецца з ледзь не сяброўскіх жартаў.

Вось і ў наступнай кватэры міліцыянераў прымаюць, можна сказаць, з хлебам-соллю. Жанчына-пенсіянерка адразу ж прапануе пачаставацца селядцом «пад футрам» і прызнаецца, што пасля апошняга візіту міліцыі муж паспакайнеў. Дарэчы, хатні дэбашыр спраўна наведвае саветы прафілактыкі пры грамадскім пункце аховы правапарадку, якраз сёння быў на чарговым пасяджэнні.

Ёсць, па словах участковага, і дэбашыры з асаблівымі звычкамі. Адзін з такіх працуе дворнікам на тэрыторыі каля апорнага пункта. Таму і сачыць за ім проста — калі з раніцы побач чыста, значыць, усё нармальна. Калі не — трэба неадкладна наносіць візіт. «Увогуле, мужчына вельмі добры, — кажа Віктар Сянькевіч. — Любіць рыбалку, ездзіць на Свіслач круглы год. Раней быў футбалістам, прычым высокага ўзроўню, гуляў у Ленінградзе. Адно дрэнна — недзе раз на год у яго здараецца страшэнны запой. Тады паспявае і дома пахуліганіць, і ў выцвярэзнік трапіць. І, шчодрая душа, частуе ўсіх мясцовых алкаголікаў. Добра, што хутка супакойваецца».

Перад дзвярыма наступнай кватэры нас папярэджваюць: сям'я раней была вельмі праблемнай. Адзін з візітаў міліцыі сюды адбыўся пасля таго, як жонка ўдарыла мужа па галаве сякерай. На месцы аказваецца, што сітуацыя змянілася карэнным чынам.

— Як вы пажываеце? Якая сітуацыя ў сям'і? — пытаецца ўчастковы.

— Цяпер — выдатна, — усміхаецца гаспадыня, седзячы ў арыстакратычнай позе на кухні. — Здаецца, мой мужчына пачаў трохі задумвацца і зусім перастаў піць. Шкада толькі, што давялося праз столькі ўсяго прайсці і звярнацца па дапамогу ў органы. Праўда, было яшчэ адно выхаваўчае «мерапрыемства» — муж пажыў некалькі месяцаў з маім бацькам, вайскоўцам у адстаўцы. Там яму таксама шмат што патлумачылі.

Спачатку ўспрымаем за жарт прызнанне жанчыны аб тым, што падчас сваіх перажыванняў яна напісала цэлую паэму пра алкаголікаў. Але гэта аказваецца праўдай — Марыя дастае са стала велізарны сшытак і дэкламуе некалькі радкоў. Дарэчы, літаратура ў жанры нон-фікшн: усе сцэны здараліся з паэткай-аматаркай у рэальным жыцці. Напрыклад, удар па твары за гадзіну да ўласнага вяселля, пасля чаго давялося замазваць і хаваць ад гасцей сіняк...

У наступнай кватэры — таксама вартая ўвагі гісторыя. Гаспадар-пенсіянер знаходзіцца ў перманентным канфлікце з жонкай. Мы заходзім у кватэру, калі жанчына толькі-толькі вярнулася з прагулкі з унукам. Па яе прызнанні, ніякія захады міліцыі эфекту не даюць. Ды і звычайнымі метадамі тут асабліва не скарыстаешся — адправіць 65-гадовага мужчыну на «адпачынак» для разваг над сваімі паводзінамі ў ЛПП нельга. А штрафы за адміністрацыйныя правапарушэнні моцна б'юць па ўсёй сям'і, а не толькі па самім дэбашыры.

Усіх сваіх «кліентаў» Віктар Сянькевіч ведае асабіста. Некаторыя літаральна выраслі на вачах участковага.

Віктар Сянькевіч прапануе жанчыне скарыстацца іншым метадам — на месяц выселіць мужа ў інтэрнат, абмежаваўшы яго стасункі з сям'ёй. Пачуўшы гэтыя словы, мужчына літаральна ўспыхвае. З крыкам, што ён годна пражыў сваё жыццё, не сядзеў і не краў, прыгражае: калі такое здарыцца, ён скончыць жыццё самагубствам і пакіне запіску, у якой абвінаваціць у сваім учынку міліцыю.

Перапалка працягваецца ўжо паміж сужэнцамі, і ніякіх ілюзій аб паляпшэнні сітуацыі не застаецца. Участковы папярэджвае, што яго візіты стануць часцейшымі — гаспадар абяцае не адчыняць дзверы. Міліцыянеры запрашаюць жанчыну для абмеркавання сітуацыі ў РУУС. Менавіта там будзе вырашацца праблема гэтай сям'і.

— Тут сітуацыя вельмі складаная, — кажа Віктар Сянькевіч, калі мы ўжо пакінулі кватэру. — Справа ў тым, што некалькі гадоў таму ў гаспадара памёр сябар па мянушцы Кінг-Конг. Здарылася гэта перад яго чарговай адпраўкай у ЛПП. З тых часоў пенсіянеру, відаць, няма з кім абмеркаваць цяжкі лёс і праблемы сусветнага маштабу, вось ён і чапляецца да родных на п'яную галаву. Відаць, адзінае выйсце — ахоўнае прадпісанне... Але сачыць за ім трэба вельмі пільна, каб не пачуваў сябе беспакараным.

— У прынцыпе скаргаў у мяне нама, — кажа наступная гаспадыня, маладая жанчына. — Пасля прафілактычнай размовы мінулым разам, здаецца, супакоіўся...

Гаворка ідзе пра яе свёкра. Пасля смерці жонкі мужчына не прыняў жонку свайго сына, якую той прывёў у кватэру, і распачаў сапраўдную вайну. «Баявыя дзеянні» пачынаюцца, вядома, на п'яную галаву.

Трохі пазней жанчына прызнаецца: праблема канчаткова не знікла. Засталіся пагрозы, шантаж высяленнем, бясконцыя абразы і іншае.

— Можаце спытаць у суседзяў, як ён сябе паводзіць, калі вып'е. Вось мы з імі сябруем, але ў госці да нас не ходзяць, бо ведаюць, які тэатр тут штовечар. Мяне ён баіцца, бо ведае, што магу выклікаць міліцыю. Можа, толькі гэта і стрымлівае яго цяпер. Апошні месяц цішыня, дагэтуль жа быў у двухмесячным запоі. Здароўя хапае, таму працягвае працаваць і на пенсіі. Адтуль і грошы: каля 10 мільёнаў штомесяц.

Участковы пытаецца, чым можа дапамагчы міліцыя. Жанчына мяркуе, што свёкра выратуе толькі нарколаг. Спыняюцца на варыянце з візітам урача на дом. Застаецца спадзявацца, што гэты выхад сапраўды зможа скончыць пакуты сям'і...

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

lyskavets@zviazda.by

Пакуль адзін міліцыянер праводзіць размову, другі займаецца афармленнем дакументаў.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Приорбанк RZB Group

«ПРИОРБАНК» Открытое акционерное общество,
220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А.

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2015 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	на 1 октября 2015	на 1 октября 2014
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		1 197 365	989 372
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		4 653	2 577
4	Средства в Национальном банке	1103		2 037 128	1 275 227
5	Средства в банках	1104		3 228 239	1 385 677
6	Ценные бумаги	1105		2 045 886	1 801 109
7	Кредиты клиентам	1106		17 905 497	13 620 458
8	Производные финансовые активы	1107		1 567 931	913 810
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		3 565	3 912
10	Инвестиции в зависимые юридические лица			-	-
11	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица			-	-
12	Основные средства и нематериальные активы	1109		1 476 628	1 335 716
13	Имущество, предназначенное для продажи	1110		22 285	2 010
14	Деловая репутация			-	-
15	Отложенные налоговые активы	1111		-	79
16	Прочие активы	1112		397 541	828 306
17	**ИТОГО активы**	**11**		**29 886 718**	**22 158 253**
18	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
19	Средства Национального банка	1201		-	5 601
20	Средства банков	1202		6 607 703	4 560 161
21	Средства клиентов	1203		17 146 945	12 831 631
22	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		79 972	209 236
23	Производные финансовые обязательства	1205		1 740	4 343
24	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
25	Прочие обязательства	1207		1 762 205	1 147 413
26	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**25 598 565**	**18 758 385**
27	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
28	Уставный фонд	1211		412 279	412 279
29	Эмиссионный доход	1212		-	-
30	Резервный фонд	1213		1 267 410	954 469
31	Фонд переоценки статей баланса	1214		709 113	657 344
32	Накопленная прибыль	1215		1 849 613	1 338 833
33	Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации-банку			4 238 415	3 362 925
34	Доля неконтролирующих акционеров			49 738	36 943
35	Всего собственный капитал	121		4 288 153	3 399 868
36	Итого обязательства и собственный капитал	12		29 886 718	22 158 253
37	Капитал дочерних юридических лиц			-	-

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2015 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	на 1 октября 2015	на 1 октября 2014
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		2 558 210	1 640 145
2	Процентные расходы	2012		1 037 670	768 180
3	Чистые процентные доходы	201		1 520 540	871 965
4	Комиссионные доходы	2021		1 051 437	911 713
5	Комиссионные расходы	2022		194 679	140 529
6	Чистые комиссионные доходы	202		856 758	771 184
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		2 124	578
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(16 777)	98
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		260 814	180 645
10	Чистый доход по операциям с производными инструментами	206		560 669	92 520
11	Чистые отчисления в резервы	207		1 522 915	474 229
12	Прочие доходы	208		1 607 643	887 842
13	Операционные расходы	209		2 023 565	1 439 968
14	Прочие расходы	210		104 148	87 481
15	Прибыль до налогообложения	211		1 141 143	803 154
16	Налог на прибыль	212		242 230	132 942
17	**ПРИБЫЛЬ**	**2**		**898 913**	**670 212**
18	Доля в прибыле (убытке) зависимых юридических лиц			-	-
19	Доля в прибыле (убытке) совместноконтролируемых юридических лиц			-	-
20	**ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**			**898 913**	**670 212**
19	Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку			884 538	654 750
20	Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке)			14 375	15 462

Председатель Правления С.А. Костюченко

Главный бухгалтер В.В. Манцивода

Данная отчетность опубликована на официальном сайте банка **https://www.priorbank.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190.

ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

В опубликованную 17 ноября 2015 г. в газете «Звязда» № 222 проектную декларацию о проекте строительства многоквартирного жилого дома по адресу: Минская область, Дзержинский район, г. Фаниполь, ул. Мира внести следующее и изменение.

Четвертый и шестой абзац раздела «Характеристика объекта» изложить в следующей редакции:

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:

1-2-комнатные квартиры при поэтапной оплате – 14 000 000 руб.;
1-2-комнатные квартиры при 100% оплате в течение 20 банковских дней с момента заключения договора – 12 700 000 руб.

Права застройщика на земельный участок подтверждает свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 26 января 2015 г. № 620/837-9005. Площадь земельного участка – 0,7404 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

УНП 100008115

ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

В опубликованную 12 ноября 2015 г. в газете «Звязда» № 219 проектную декларацию (о проекте строительства объекта «Застройка микрорайона «Лошица-9». 1-я очередь. Жилой дом №10 по генплану) внести следующее и изменение.

Четвертый абзац раздела «Характеристика объекта» изложить в следующей редакции:

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:

1-2-комнатные квартиры при поэтапной оплате – 18 000 000 руб.;
1-2-комнатные квартиры при 100% оплате в течение 20 банковских дней – 16 000 000 руб.

УНП 100008115

ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

В опубликованную 28 ноября 2015 г. в газете «Звязда» № 231 проектную декларацию (о проекте строительства многоквартирного жилого дома № 11 по генплану в микрорайоне Лошица-9) внести следующее и изменение.

Четвертый абзац раздела «Характеристика объекта» изложить в следующей редакции:

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:

1-2-комнатные квартиры при поэтапной оплате – 18 000 000 руб.;
1-2-комнатные квартиры при 100% оплате в течение 20 банковских дней – 16 000 000 руб.

УНП 100008115

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62

Продавец: ОАО «Плисский льнозавод», Витебская обл., Глубокский р-н, г.п. Подсвилье, ул. Советская, 83, (029) 598-99-44

Лот №1. Специальное транспортное средство (прицеп бортовой тракторный) СТС-12, рег. знак БЯ 0917, 2008 г.в. **Начальная цена:** 86 508 000 бел. руб. с НДС. **Размер задатка:** 8 650 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 4 326 000 бел. руб.

Лот №2. Специальное транспортное средство (прицеп бортовой тракторный) СТС-12, рег. знак БЯ 0918, 2008 г.в. **Начальная цена:** 86 508 000 бел. руб. с НДС. **Размер задатка:** 8 650 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 4 326 000 бел. руб.

Лот №3. Трактор Белорус 82.1, рег. знак ВА-2 4686, 2007 г.в. **Начальная цена:** 77 760 000 бел. руб. с НДС. **Размер задатка:** 7 776 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 3 888 000 бел. руб.

Повторные торги состоятся **15.01.2016 в 12.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: **с 23.12.2015 с 8.30 по 14.01.2016 до 17.30.** Задаток перечисляется на р/с №3012470594456 в РКЦ №39 филиала ОАО «Белагропромбанк» Витебское областное управление код 424, УНП 300019491. Получатель платежа: ОАО «Плисский льнозавод». Местонахождение объектов: Витебская обл., Глубокский р-н, г.п. Подсвилье, ул. Советская, 83. Извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.10.2015

Продавец: унитарное частное торговое предприятие «Автотехсоюз», Витебская обл., Полоцкий район, Экимanский с/с, д. Бельчица, ул. Центральная, д. 4, комн. 1, (029) 711-43-22

Лот №1. Капитальное строение с инв.№250/С-4479 по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. 23-х Гвардейцев, д. 43 площадью 197,2 кв.м, назначение – одноэтажный блочный жилой дом, наименование – жилой дом №43, в т.ч.: мансарда, холодная пристройка, терраса, сарай, гараж, забор металлическая сетка на металлических столбах, забор кирпичный на кирпичных столбах, дворовое покрытие асфальтобетонное, ворота с калиткой металлические. **Начальная цена:** 1 127 880 000 бел. руб. с НДС**. Размер задатка:** 112 788 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 56 394 000 бел. руб.

Торги состоятся **25.01.2016 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: **с 23.12.2015 с 8.30 по 22.01.2016 до 17.30.** Задаток перечисляется на р/с №3012401350018 в ЦБУ №603 ОАО «Белинвестбанк» г. Полоцк, код 739, УНП 390182452. Получатель платежа: УП «Автотехсоюз»

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копию свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 (пяти) дней со дня проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектом осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. **Контактный тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by**

РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «СПЕЦЖЕЛЕЗОБЕТОН»

Номер лота	Марка транспортного средства, гос.номер	Год выпуска	Инв. №	Начальная цена, бел. руб. без НДС	Размер задатка, бел. руб.	Фактическое состояние
Лот №1	Погрузчик дизельный HELI CPCD70	2010	1836	92 012 000	9 201 200	удовлетворительное
Лот №2	Станок токарно-винторезный 1К62	1970	3065	11 069 000	1 106 900	после капремонта

Местонахождение объекта	Брестская обл., Лунинецкий р-н, г. Микашевичи
Условия продажи	Без условий
Продавец (Балансодержатель)	ОАО «Спецжелезобетон»
Организатор торгов	РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20-ти рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи
Номер р/сч для перечисления задатка	р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509

